КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №42 (170)
◂ 13 ЛІСТАПАДА ◂ 2009 г.

# Новы Час



### ВОСЕНЬСКІЯ ФАНТАЗІІ

Стар. 4

### РЭЛЯТЫВІСЦКАЯ МАРАЛЬ

За некалькі дзён да ўшанавання ахвяраў масавых расстрэлаў у Курапатах "СБ. Беларусь сегодня" нечакана звярнулася да тэмы рэдакцыйным артыкулам Паўла Якубовіча, дапоўненым матэрыяламі "круглага стала".

Стар. 6

### НОВАЕ КОСАВА

Правінцыя Ваяводзіна вяртае сабе статус аўтаноміі. Ці стане гэта пачаткам чарговага этапу развалу Сербіі?

Стар. 13

### ЭПІДЭМІІ Ў ЛІТАРАТУРЫ

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Артыкул Сяргея Нікалюка**

### У рэжыме спецаперацыі

**З цыклу "Азбука паліталогіі"**

**АД РЭДАКТАРА**

# НА ВЕТРАЗЯХ 12 УМОЎ

*Аляксей Кароль*

**На ветразях 12 умоў, сфармуляваных Еўрасаюзам, паімчыцца Беларусь да свабодных і справядлівых выбараў. Спачатку мясцовых, а потым і прэзідэнцкіх. Тое, пра што так доўга марыла апазіцыя, урэшце мае адбыцца. Па абяцанню кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнкі.**




Менавіта так можна зразумець яго заявы на нарадзе, прысвечанай удасканаленню выбарчага заканадаўства, што адбылася 10 лістапада пры ўдзеле старшыні Цэнтрвыбаркаму Лідзіі Ярмошынай. Алергіі на гэтыя ўмовы, якіх 12 ці 15, высвятляецца, няма. Ужо бліжэйшым часам іх, аказваецца, можна спакойна прыняць. Ну і, вядома ж, выбары "павінны быць сумленнымі, справядлівымі і адкрытымі".

Калі выпусціць з-пад увагі кантэкст і сыходзіць з літары гэтых заяваў, то іх можна ўспрыняць як старт на сапраўдную дэмакратызацыю палітычнай сістэмы Беларусі. Бо 12 умоў — гэта не што іншае, як пералік менавіта дэмакратычных рэформ, першая з якіх якраз і патрабуе забяспечыць свабодныя і справядлівыя выбары. З чаго, уласна кажучы, і пачынаецца дэмакратыя.

Але сапраўдны сэнс паслання А. Лукашэнкі якраз хаваецца ў кантэксце. Ветразі тыя будуць шыцца беларускімі шаўцамі, з беларускага матэрыялу і па шматкроць апрабаваных лякалах. Адна справа, калі курс на рэформы абвяшчае лідэр дэмакратычнай краіны. Тут усім ясна, што гэта курс вядучай на той момант палітычнай сілы, з адпаведнай адказнасцю пад публічным кантролем грамадства.

І зусім іншая — калі новы курс на перамены абвяшчае аўтарытарны лідэр, у руках якога сканцэнтравана ўся паўната ўлады. Гэта можа быць эмацыйны ўсплёск без працягу. Можа быць тактычны ход дзеля дасягнення зусім іншых мэтаў. І толькі зрэдку — заява на сапраўдныя рэформы існуючай сістэмы. Як тое было з рэформамі Аляксандра II на пераўтварэнне Расіі з абсалютнай манархіі ў канстытуцыйную. Ці, апошні па часе прыклад, з Перабудовай Гарбачова.

Хацелася б верыць, але беларускі палітычны кантэкст не дае падстаў на спадзяванні, што 10 лістапада быў дадзены старт на сапраўдныя рэформы, прынамсі выбарчай сістэмы. Выразна праглядаецца менавіта тактычны разлік. Пачынаючы з даты: заявы прагучалі за 10 дзён да разгляду Еўрасаюзам пытання аб прыпыненні санкцый. І, на што звярнуў увагу аналітык "Радыё "Свабода" Юры Дракахруст, неўзабаве пасля таго, як Міжнародны валютны фонд упершыню станоўча выказаўся адносна магчымасці выдзялення Беларусі новага крэдыту stand-by пасля завяршэння ў красавіку 2010 года дзейнай праграмы. Рэжыму вельмі патрэбны адмена санкцый і крэдыты. Калі яшчэ там выбары, а грошы патрэбны сёння, каб зняць небяспеку сацыяльнага абвалу з непрадказальным сцэнарам развіцця і наступстваў.

Да таго ж, прамінуў ужо год ад пачатку дыялога. 12 умоў — даўно не навіна. І яшчэ ў маі яны былі ахарактарызаваны А. Лукашэнкам як "наіўныя і непрымальныя", скіраваныя выключна на тое, каб "зламаць выбарчае заканадаўства, зламаць заканадаўства пра СМІ, усё зламаць, распусціць і гэтак далей".

Таму і не наглядалася пэўных заўважных крокаў па іх выкананні. Перамены ў рыторыцы і лёгкія саступкі ў палітычнай практыцы з боку ўладаў за мінулы год цяжка прыняць за манеўры вярхоўнага рэфарматара з мэтай прытушыць супраціў кансерватараў з уласнага атачэння.

З кантэксту вынікае і тэкст. Пасланне А. Лукашэнкі ад 10 лістапада зроблена пад знешнепалітычным ціскам: "ЕС, Расія, ЗША нам намякаюць на тое, што нешта недзе трэба падкарэктаваць" . Гэта пасланне — "два ў адным": Еўропе і ўласнай наменклатуры. Еўропе: умовы выканаем. Сваім: усё застанецца пад нашым кантролем. Ключавыя словы: "Галоўнае, каб усе змены адпавядалі літары і духу нашай Канстытуцыі". Цудоўныя словы з абсалютнай адпаведнасцю лексікону прававой дзяржавы. Але з істотнымі беларускімі нюансамі.

Па-першае, удакладніў А. Лукашэнка, няма аніякай неабходнасці правядзення яшчэ аднаго рэферэндуму па зменах Канстытуцыі. Гэта азначае, што ніякіх паправак на абмежаванне правоў дзеючага прэзідэнта вылучацца бясконцую колькасць разоў быць не можа. Ці не ёсць гэта знакам намеру А. Лукашэнкі ісці на чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін? І адначасова сігналам-перасцярогай новым магчымым марынічам і казулінам?

Па-другое, лібералізацыя, папярэдзіў прэзідэнт, не павінна прывесці да палітычных беспарадкаў і анархіі падчас будучых выбарчых кампаній. Адпаведным чынам, каб не страціць нідзе і ніяк поўнага кантролю за ходам і вынікамі выбараў, адслупавана і тэрыторыя змен выбарчага працэсу. Кандыдатаў на прэзідэнты можа быць шмат. Ім будзе дазволена ствараць свае фонды — хай трацяцца. У выбарчыя камісіі могуць дапусціць пэўную колькасць прадстаўнікоў ад партый і грамадскіх арганізацый. Усё гэта кантралюемае.

А вось тое, што можа выйсці з-пад кантролю і паўплываць на вынікі — жорстка рэгламентавана. У прыватнасці, арганізацыя наглядання без вызначэння яго канкрэтнага фармату цалкам аддаецца на волю мясцовых уладаў. А значыць, і на адказнасць перад цэнтрам, які ні ў чым не вінаваты. Правядзенне масавых мерапрыемстваў вяртаецца ў рамкі паведамляльнай працэдуры, але жорстка абмяжоўваецца дакладна вызначаным месцам. Кожнай акрузе — свой маленькі Бангалор.

Як выглядае з агучаных прапаноў, новая мадэль выбараў, па задуме яе архітэктараў, павінна стаць прымальнай для Еўропы як адпавядаючая дэмакратычным стандартам і адначасова застацца па-ранейшаму цалкам падкантрольнай уладам. Хаця, па пэўных параметрах, мадэль гэта больш складаная і рызыкоўная для наменклатуры. Чым завершыцца вымушаны эксперымент?

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРАСЛАЎ. ЗУСІМ НЕ КОПІЯ ВАРШАЎСКІХ “ЛАЗЕНАК”

Будучы санаторны комплекс на Браслаўшчыне, як сведчаць ініцыятары яго ствярэння, не будзе копіяй славутых варшаўскіх “Лазенак”. Ды і навошта, бо іх копія ўжо ёсць — палац Умястоўскіх у Жэмыслаўлі пад Іўем. Комплекс паўстане пад Браславам, у вёсцы Відзы-Лаўчынскія. Інвестар з Латвіі збіраецца ўкласці ў яго будаўніцтва 50 мільёнаў долараў. Як сведчыць гісторыя, варшаўскі парк “Лазенкі” (Палац на Выспе) звязаны з імем апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага і вядомы зараз кожнаму жыхару ці госцю польскай сталіцы. Напрыканцы XVIII стагоддзя ён перабудаваў Уяздоўскі замак караля Жыгімонта III Вазы, а лес перайтварыў у парк. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай своеасаблівым пратэстам супраць Расіі стала капіяванне мясцовай шляхтай знакавых будынкаў захопленай Радзімы. У 1828 годзе маршалак з-пад Ашмян Казімір Умястоўскі разам з жонкай Юзэфай у Жэмыслаўлі пачалі пабудову сваіх “Лазенак”. Цяпер ад іх захаваліся галоўныя элементы і часткова інтэр’еры палацу.

### БЯЛЫНІЧЫ. ПРАБЛЕМЫ З ВЫПЛАТАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ

Амаль ва ўсіх сельгаспрадпрыемстваў Бялыніцкага раёна (за выключэннем СВК “Калгас “Радзіма”) у апошні час узніклі вялікія праблемы з выплатай заработнай платы сваім працаўнікам. У апошнія дні наступнага месяца выплачваюць заробак за папярэдні нават у гаспадарцы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ААТ “Новая Друць”. У шэрагу ж больш “слабых” сельгаспрадпрыемстваў раёна заробкі працаўнікам затрымліваюць наогул на больш значны тэрмін. Па гэтаму пытанню працаўнікі сельскай гаспадаркі пачалі звяртацца ў пракуратуру і суд Бялыніцкага раёна, некалькі чалавек звярнуліся з адпаведнай інфармацыяй і да журналістаў.

Выклікае вялікае здзіўленне, што гэта праблема абсалютна не зацікавіла “абаронцаў” інтарэсаў працоўных з прэзідыума савета Магілёўскага абласнога аб’яднання прафсаюзаў, выязное пасяджэнне якога днямі прайшло ў Бялыніцкім раёне. Як паведаміла раённая дзяржаўная газета “Зара над Друццю”, “вывучаны на Бялыніччыне вопыт будзе паспяхова скарыстаны і ў іншых раёнах вобласці”.

### БАРАНАВІЧЫ. ЗАГІНУЛІ ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ПАРАСЯТ

У Баранавіцкім раёне на комплексе па вытворчасці свініны загінулі дзве тысячы парасят. Прыкладна каля трох гадзін дня ў Баранавіцкі РАУС з гаррайаддзела па НС паступіла інфармацыя аб тым, што ў 05.45 на комплексе па вытворчасці свініны “Усходні” (структурнае падраздзяленне ААТ “Баранавічыхлебапрадукт”), размешчаным недалёка ад вёскі Саўрукі, адбылося адключэнне электразабеспячэння. У выніку была спынена праца сістэмы прымусовай вентыляцыі ў двух свінарніках. Загінула дзве тысячы галоў жывёлы вагой 25–30 кілаграмаў кожная. У 07.45 аварыйнай брыгадай РУП “Баранавіцкія раённыя электрычныя сеткі” энергазабеспячэнне ў будынках было адноўлена. Сума ўрону высвятляецца.

У КВС “Усходні” БелаПАН паведамілі, што на комплексе працуе міжведамасная камісія, якая высвятляе ўсе акалічнасці здарэння.

### МАСТЫ. ГРОШАЙ НЕ ХАПАЕ

Пасля прыняцця мастоўскім райсаветам зменаў у раённы бюджэт утварыўся дэфіцыт у памеры амаль 2,9 мільярда рублёў. Аднак у рашэнні райсавета адсутнічаюць крыніцы пагашэння дэфіцыту. Паводле Бюджэтнага кодэксу Беларусі, пры рашэннях, якія выклікаюць дэфіцыт бюджэту, павінны вызначацца крыніцы пагашэння дэфіцыту. “На працягу апошняга года я неаднаразова звяртаўся ў Мастоўскі райсавет, Гродзенскі аблсавет наконт парушэнняў Бюджэтнага кодэксу, аднак на ўсе звароты атрымліваў звычайныя адпіскі. Прычым змест адказаў у мяне выклікаў пытанні наконт прафесійных якасцяў людзей, што займаюць адпаведныя пасады”, — падкрэсліў дэпутат Мастоўскага райсавета Дзмітрый Кухлей.

ЗАКЛІК

## ПАМІЛАВАЦЬ АСУДЖАНЫХ НА СМЕРЦЬ

Генадзь Кеснер

**“Міжнародная амністыя” заклікае беларускага прэзідэнта памілаваць асуджаных на смяротнае пакаранне Андрэя Жука і Васіля Юзэпчука, заявіла 10 лістапада падчас прэс-канферэнцыі прадстаўнік гэтай праваабарончай арганізацыі, эксперт па Беларусі Хэза Макгіл. Памілаваць сына просіць Аляксандра Лукашэнку і маці Андрэя Жука Святлана Жук, якая таксама прысутнічала на сустрэчы з журналістамі.**

Перад гэтым Хэза Макгіл узяла ўдзел у арганізаваным Офісам АБСЕ ў Мінску мерапрыемстве па абмеркаванню пытання смяротнага пакарання з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі, Міністэрства юстыцыі, Вярхоўнага суда, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

“Адна з праблемаў — гэта менавіта пакуты, якія смяротная кара прыносіць сваякам вязняў. Паводле рашэння Камітэта па правах чалавека ААН, прынятага ў 1999 годзе, сакрэтнасць, якой ахутана смяротнае пакаранне ў Беларусі, на самай справе, у дачыненні да сваякоў прыраўноўваецца да катаванняў. Таму што чалавек, асуджаны да пакарання смерцю, не ведае, калі ён можа быць расстраляны, і сваякі таксама нічога не даведаюцца, нават дату. Гэта вельмі цяжкое выпрабаванне для людзей. Гэта цяжка для вязняў, якія кожную хвіліну чакаюць, калі расчыняюцца дзверы, і іх павядуць на смерць. Гэта жахліва для сваякоў, якія нічога не ведаюць. Яны не могуць развітацца з родным чалавекам, не атрымаюць яго цела і нават яго рэчы, не будуць ведаць, дзе ён пахаваны”, — падкрэсліла Хэза Макгіл.

Святлана Жук, чый 25-гадовы сын Андрэй прыгавораны да расстрэлу за забойства работнікаў СВК “Бальшавік Агра” (Салігорскі раён), вырашыла звярнуцца наўпрост да прэзідэнта Беларусі з просьбай памілаваць яе сына, у якога, дарэчы, ёсць двое малых дзяцей.

“Так, Андрэй вінаваты. Ён не меў права ні пры якіх абставінах пазбаўляць жыцця гэтых людзей. Але атрымліваецца, што ў мяне на вачах зараз забіваюць майго сына. І я не хачу і не магу з гэтым прымірыцца. І ён, і мы, ягоныя родныя, да скону сваіх дзён будзем вымольваць прабачэнне за гэты цяжкі грэх у сем’яў загінулых і ў Бога. І я буду прасіць прэзідэнта даць Андрэю шанец сваёй працай загладзіць сваю віну і заслужыць прабачэнне сем’яў пацярпелых”, — сказала Святлана Жук журналістам.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч нагадаў, што 30 кастрычніка бягучага года Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў у неадкладным парадку пад нумарам 1910/2009 індывідуальны зварот Святланы Жук. Жэнеўскі офіс Вярхоўнага камісара па правах чалавека накіраваў Рэспубліцы Беларусь паведамленне пра рэгістрацыю звароту і патрабаванне не прыводзіць у выкананне смяротны прысуд, пакуль справа знаходзіцца на разглядзе гэтага камітэта.

Хэза Макгіл, у сваю чаргу, нагадала, што Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, а таксама на постсавецкай прасторы, дзе дагэтуль прымяняецца такая вышэйшая мера пакарання, як расстрэл. Адным з асноўных патрабаванняў для вяртання беларускаму парламенту статуса спецыяльна запрошанага ў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы з’яўляецца менавіта ўвядзенне мараторыя на смяротнае пакаранне.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

## БУЛЬБУ ЗААРАЛІ

Іван Барысаў

**Калі 23 кастрычніка мне на хатні тэлефон пазваніў сталы чытач газеты “Паходня”, мой даўні знаёмы Сяргей, і паведаміў, што каля вёскі Вольніца Бялыніцкага раёна трактары заворваюць поле з нявыкапанай бульбай, прызнацца, я адразу не паверыў і вырашыў, што ён штосьці наблытаў.**

Як гэта можа быць, каб у гэтым годзе, калі бульба паўсюдна не ўрадзіла і кошты на яе выраслі амаль у два разы, хтосьці мог дадумацца да таго, каб закапаць нядрэнны ўраджай у зямлю. Таму адразу вырашыў праверыць гэту інфармацыю, запрог каня і паехаў на бульбяное поле каля вёскі Вольніца.

Там я сваімі вачамі змог пераканацца, што чытач нашай газеты сапраўды сказаў чыстую праўду. Магутныя трактары МТЗ заворвалі поле з нявыкапанай бульбай, з другога боку працаваў трактар з культыватарам, які таксама хадзіў па бульбяному полю і пасля яго бульбу збіралі людзі. Як высветлілася пазней, гэта была так званая “біржа” (людзі, якія стаяць на ўліку ў цэнтры занятасці насельніцтва). Удалечыні збіралі бульбу на той тэрыторыі, дзе раней прайшлі бульбаўборачныя камбайны, каля дзесятка жыхароў навакольных вёсак: Вольніцы, Сякеркі, Машчаніцы. У хуткім часе супрацоўнікі цэнтра занятасці скончылі загружаць трактарны прычэп з бульбай і з’ехалі дадому ў Бялынічы.

Трактары з плугамі працягвалі працаваць на ўчастку з некранутымі баразнамі, закопваючы ў зямлю вырашчаны ўраджай.

Жыхары навакольных вёсак былі літаральна шакіраваны такім развіццём падзей. Па словах Аляксандра, жыхара вёскі Вольніца, бульбу пасля бульбаўборачных камбайнаў дазволілі збіраць літаральна за тры дні да гэтага, а так служба аховы ААТ “Новая Друць” адразу ж праганяла з поля. У яго дома ў гэтым годзе ўраджай цалкам прапаў з-за дажджоў, таму ён вырашыў назбіраць хоць крыху бульбы для насення і асабістага харчавання, як і іншыя прысутныя на полі мясцовыя жыхары.

Пенсіі і заробкі ва ўсіх месцічаў нізкія, у крамах набыць бульбу па высокіх коштах яны магчымасці не маюць, таму дазволу сабраць тое, што засталося пасля ўборкі, людзі былі вельмі рады. Калі ж трактары пайшлі заворваць цалкам некранутае бульбяное поле, ніхто з людзей гэтага зразумець не мог. Па іх словах, калі гаспадарцы бульба непатрэбная, яны б яе выкапалі ўласнымі сіламі за некалькі дзён. Адміністрацыя ААТ “Новая Друць” вырашыла, што лепш закапаць ураджай у зямлю.



Жыхар вёскі Машчаніца Рыгор выказаў думку, што гэта зроблена мэтанакіравана для таго, каб мясцовыя жыхары лепш куплялі бульбу ў краме гаспадаркі “Мара” і каб кошт яе заставаўся высокім.

Па словах трактарыстаў, якія працавалі на полі каля вёскі Вольніца, загад заараць нявыкапаную бульбу далі пасля таго, як з-за дажджоў на гэтым участку не змаглі працаваць бульбаўборачныя камбайны. Па іх меркаванню, гэта было зроблена дзеля таго, каб даць справаздачу аб заканчэнні ўборкі бульбы ў ААТ “Новая Друць”.

У наступныя дні 24 і 25 кастрычніка поле каля Вольніцы было цалкам пераворана. Ураджай бульбы быў закапаны ў зямлю. Тым часам кошт бульбы ў крамах Бялыніцкага раёна даўно пераваліў за тысячу рублёў за кілаграм.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

## КУКУРУЗА ПАД СНЕГАМ

Сяргей Семяновіч

**Першы снег, што выпаў на пачатку лістапада, не дазволіў завяршыць уборку кукурузы ААТ “Новая Друць”. Каля вёскі Стараселле стаіць поле з непрыбраным ураджаем.**

Нагадаем, што ААТ “Новая Друць” з’яўляецца адным з лідэраў сельскагаспадарчай галіны Бялыніцкага раёна, магутны машынна-трактарны парк прадпрыемства і яго вялікія фінансавыя магчымасці даўно выклікаюць зайздрасць у спецыялістаў з іншых гаспадарак.

Па меркаванню аднаго са спецыялістаў Райсельгасхарчу, такія праблемы ў вытворчасці ў ААТ “Новая Друць” узнікаюць таму, што ў выніку далучэння да гаспадаркі ўсё больш значных тэрыторый, з-за вялікіх памераў ёй стала вельмі цяжка кіраваць.

У свой час былы старшыня Бялыніцкага райвыканкама Аляксандр Ільянаў наогул прапанаваў Аляксандру Міхайлавічу Лапацентаву далучыць “Новую Друць” да калгаса “Радзіма”...

Што ж будзе пазней, калі скончыцца фінансаванне з Нацыянальнага банка, і гаспадарка пачне працаваць самастойна...

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСЁ ВЫКАНАЕМ

Сяргей Салаўёў

**“Спадар Лукашэнка стаміўся быць прэзідэнтам. Каранацыя прызначаная на чацвер”, — гэты анекдот цалкам можна прысвяціць сённяшняй сітуацыі. Але толькі ў першай ягонай частцы. Таму што Лукашэнка на гэтым тыдні зламаў усе стэрэатыпы.**




“Мы практычна ўсе 12 патрабаванняў ад Еўропы прымаем — без урону для нашай унутранай палітыкі”, — заявіў Аляксандр Лукашэнка 10 лістапада на нарадзе па ўдасканаленні нацыянальнага выбарчага заканадаўства. Заява сенсацыйная. Раней Лукашэнка сцвярджаў, што 12 патрабаванняў Еўрасаюза — поўная лухта, і ў нас і так усё ў парадку

“Нядаўна, сустракаючыся з прадстаўнікамі кіраўніцтва Еўрасаюза, я гаварыў ім, што ў нас няма ніякай алергіі, ніякага непрымання тых патрабаванняў, якія ўносіць Еўрапейскі саюз”, — сказаў Лукашэнка. “Проста нам трэба крыху часу”, — дадаў ён.

“Той-сёй трактуе неабходнасць змены выбарчага заканадаўства як выкананне патрабаванняў Еўрасаюза па палітычнай лібералізацыі Беларусі. Ціснуць на нас — контрпрадуктыўна, і гэта ў Еўропе разумеюць. Мы — суверэнная дзяржава і самастойна выпрацоўваем сваю знешнюю і ўнутраную палітыку, канешне, улічваючы ўсё лепшае з сусветнага вопыту”, — цытуе Лукашэнку прэс-служба прэзідэнта.

Лукашэнка лічыць, што “выбары павінны быць сумленнымі, справядлівымі і адкрытымі. І калі законы краіны трэба для гэтага палепшыць, то зрабіць гэта неабходна аператыўна”. “Мы ўжо сёння павінны прыняць прынцыповае рашэнне наконт гэтага. Пажадана, каб наш парламент ужо на гэтай сесіі правёў адпаведныя папраўкі ў нацыянальнае заканадаўства, і звесткі аб іх былі своечасова даведзены да выбаршчыкаў”, — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Але прэзідэнт падкрэсліў, што лібералізацыя выбарчага заканадаўства не павінна прывесці да палітычных беспарадкаў і анархіі падчас будучых кампаній: “Хачу засцерагчы, што разгляд магчымасці гэтых зменаў не павінен даць старт нейкім кампаніям бразгання палітычнай зброяй. Таму што калі мы цяпер, у гэты час эканамічных цяжкасцей, пачнём гэтым займацца, то мы наўрад ці выберамся з гэтага стану”.

Выбары — гэта, канешне, добра, асабліва калі на іх ёсць выбар. Але патрабаванні Еўрасаюза не тычацца толькі выбараў. Умовы палягаюць не толькі ў межах выбарчага заканадаўства. Там былі пункты і пра незалежную судовую сістэму, і пра свабоду СМІ, і пра забарону смяротнага пакарання, і пра незалежнае расследаванне спраў зніклых палітыкаў.

І амаль адразу ўлады дазволілі Беларускі еўрапейскі форум. Ён пройдзе ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода 14 лістапада. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні грамадскага аб'яднання Рух “За Свабоду” Юрый Губарэвіч.

Раней усе спробы знайсці памяшканне для яго правядзення заканчваліся безвынікова. Але, пасля заяў пра тое, што мерапрыемства можа прайсці на Кастрычніцкай плошчы Мінска, раніцай 11 лістапада Губарэвічу патэлефанаваў начальнік аддзела масавых мерапрыемстваў упраўлення ідэалогіі Мінгарвыканкама Эдуард Тамільчык. Ён паведаміў, што Мінгарвыканкам дазваляе правесці форум у ДК МАЗа.

Узнікае адно пытанне: гэта лібералізацыя або адмысловая дыверсія? Бо зараз “свіны грып” крочыць па краіне. І любыя масавыя мерапрыемствы наўпрост небяспечныя для здароўя.

На 10 лістапада ў Беларусі было зарэгістравана ўжо 128 лабараторна пацверджаных выпадкаў захворвання, выкліканых вірусам грыпу А (H1N1). Такія даныя абнародаваў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр эпідэміялогіі і мікрабіялогіі.

Яшчэ 8 лістапада намеснік міністра аховы здароўя, галоўны санітарны ўрач Валянціна Качан паведаміла, што ў краіне зафіксаваны 102 такія выпадкі.

У РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі падкрэсліваюць, што маніторынг захворвання на вострыя рэспіраторныя захворванні праводзіцца штодня. Працягваюцца лабараторныя даследаванні па выяўленні вірусаў грыпу ў клінічных узорах, узятых у хворых з дыягназам ВРВІ.

Дарэчы, у сувязі з высокім узроўнем захворвання на грып і ВРВІ на няпэўны час быў перанесены канцэрт, прысвечаны гадавіне кампаніі “Будзьма беларусамі!”. Такое рашэнне было прынята каардынатарамі “Будзьма беларусамі!”. Канцэрт павінен быў прайсці 8 лістапада ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ў Мінску.

Арганізатары паабяцалі, што святочны канцэрт абавязкова пройдзе да Новага года. Усе запрашэнні на канцэрт, якія павінен быў адбыцца 8 лістапада, будуць сапраўдныя. Месца яго правядзення таксама не зменіцца. Інфармацыя пра дакладную дату яго правядзення будзе апублікавана на сайце кампаніі.

Можа, і Еўрафорум трэбы было б перанесці? Хаця наўрад ці апазіцыянерам грып пагражае. За апошнія два тыдні прайшлі: з'езд БХД; “Дзяды” ў Курапатах; “Дзяды” ў Лошыцы... А захварэў толькі адзін Алесь Бяляцкі з “Вясны”. І тое захварэў ён на пнеўманію яшчэ месяц таму. Апазіцыянераў зараза чамусьці не бярэ. Больш за 700 чалавек на з'ездзе БХД, каля тысячы на “Дзядах” у Курапатах, каля 50 (уключна з журналістамі і супрацоўнікамі міліцыі) у Лошыцы... Здаецца, усе павінны былі б апынуцца ў бальніцах. Але ж не апынуліся! Чаму? Можа, апазіцыйнасць — найлепшы сродак ад грыпу?

Інакш не можна зразумець логіку беларускіх чыноўнікаў мясцовага ўзроўню. Здаецца, у персанальным змаганні з хваробай яны прымаюць дзіўныя рашэнні. Такія, пра якія і не марылі нават самыя апантаныя нацыяналісты з “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”.

У Мінску з'явіцца вуліца Ефрасінні Полацкай. Імя заступніцы Беларусі будзе нададзена адной з цяпер безыменных вуліц у Фрунзенскім раёне сталіцы. Яна прымыкае да прыходу ў гонар іконы Божай Маці “Усіх тужлівых Радасць”, на тэрыторыі якога знаходзіцца невялікая Свята-Ефрасінеўская царква. Адміністрацыя раёна накіравала ва ўпраўленне культуры Мінгарвыканкама ліст з прапановай так назваць гэту вуліцу. Канчатковае рашэнне прыме Камісія па назве і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складовых частак горада.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ГЕОРГІЙ КОНАН




Генеральная пракуратура збіраецца прэвентыўна змагацца з хабарніцтвам у шэрагах чыноўнікаў. Як паведамляе онлайн-выданне “Ежедневник”, для гэтага плануецца правесці структурныя пераўтварэнні ў сістэме органаў дзяржаўнага кіравання. Па меркаванню намесніка генеральнага пракурора Беларусі Віктара Конана, праведзены пракуратурай аналіз сведчыць, што рост карупцыі ў краіне адбываецца з прычыны таго, што прымаемыя праваахоўнымі органамі меры носяць у асноўным папераджальны і забаронны характар і не закранаюць структурных пераўтварэнняў сістэмы дзейнасці дзяржаўнага кіравання. Структурныя пераўтварэнні мусяць прадугледжваць стварэнне сістэмы ранняга выяўлення асобаў, схільных да карупцыі, і вызваленне іх ад пасад.

Як заявіў Конан, у краіне дагэтуль не створаная сістэма першаснага кантролю за фактамі карупцыйных паводзін патэнцыйна рызыкоўных суб'ектаў кіраўнічай дзейнасці, не забяспечваецца сістэма аператыўнага адхілення такіх асобаў ад займаемых пасад. Гэта робіць барацьбу з карупцыяй падобнай на барацьбу з ветракамі і зводзіць на нуль усе намаганні праваахоўных органаў па выкараненні карупцыі ва ўладзе. На месца аднаго выяўленага карупцыянера прыходзіць іншы, і працэс пачынаецца спачатку.

У Генеральнай пракуратуры лічаць, што надышоў час карэнна змяніць падыход да барацьбы з гэтай з'явай і зрабіць акцэнт менавіта на выяўленні схільных да карупцыі службоўцаў, каб прадухіліць саму рызыку ўзнікнення карупцыйных праяў. Якім чынам пракуратура будзе выяўляць злыя намеры чыноўнікаў, не паведамляецца. Але можна параіць далучыць да працэсу экстрасэнсаў, якія будуць знаходзіць тых, каго наведваюць непрыстойныя думкі пра хабар.

### ЛЯВОН ВОЛЬСКІ



Гурт Лявона Вольскага “N.R.M.” пасля перапынку ў канцэртнай дзейнасці ў Беларусі нарэшце 17 снежня парадуе сваіх прыхільнікаў выступам з праграмай “Вялікі акустычны калядны канцэрт”. Мерапрыемства прымеркавана да 15-годдзя калектыву. Вольскі прызнаецца, што такі камерны фармат яму больш да спадобы, бо мае больш хатнюю атмасферу, дае магчымасці для імправізацыі, дый наогул атмасфера на такіх выступах добразычлівейшая.

Гурт “N.R.M.” быў адзіным са спісу забароненых выканаўцаў, хто не скарыстаўся магчымасцю выступаць пасля сустрэчы ў Адміністрацыі прэзідэнта і дамоўленасці пра зняцце абмежаванняў. Пасля таго, як у Адміністрацыі прэзідэнта рокерам паабяцалі зняць усе забароны, гурт “N.R.M.” практычна знік з музычнага абшару краіны і адмаўляўся ад удзелу ў канцэртах і фестывалях на тэрыторыі Беларусі. Самі музыкі тлумачылі гэта тым, што ўзялі творчы адпачынак. “Трэба вытрымаць паўзу. Тры гады нельга было граць, а цяпер гэта нават заахвочваецца. Думаю, што, наадварот, у гэтай сітуацыі трэба крышачку памаўчаць ды падумаць”, — цытуе словы Лявона Вольскага партал www.udf.by.

### АНДРЭЙ КУЛЕБІН



Беларус Андрэй Кулебін перамог інтэркантынентальнага чэмпіёна брытанца Майкла Дзікса ў паядынку за тытул чэмпіёна свету сярод прафесіяналаў муай-тай па версіі WMC (World Muaythai Council). Андрэй адстойваў тытул у Манчэстэры 7 лістапада. Беларускі баксёр атрымаў перамогу накаўтам. Раней Майкл Дзікс ні разу не прайграваў на сваёй арэне. Кулебіну спатрэбілася ўсяго адна хвіліна і дзве секунды на тое, каб атрымаць перамогу. Спартовец прадстаўляе мінскі клуб “Кік Файтэр” і трэніруецца пад кіраўніцтвам Яўгенія Кацельнікава.

Сёлета восенню Майкл Дзікс адмовіўся прыехаць у Мінск на турнір “Big 8”, спаслаўшыся на траўму. Тады баксёры маглі сустрэцца на рынгу ўпершыню. Набліжаныя да спартоўца людзі гаварылі пра тое, што Дзікс проста не хацеў даць суперніку магчымасці вывучыць сябе перад важным тытульным боем у Манчэстэры. Дарэчы, на гэтым турніры свой апошні бой праводзіў легендарны Санчай Сор Кінг Стар, пяціразовы чэмпіён Люмпіні і Раджадамнерн, якога двойчы прызнавалі лепшым тайбаксёрам года на радзіме муай-тай.

ІНВЕСТЫЦЫІ

# ВОСЕНЬСКІЯ ФАНТАЗІІ

Марыя Крук

**Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракопавіч заявіў, што краіне патрэбны “бум замежных інвестыцый”. Амбітныя жаданні чыноўніка лёгка разбіваюцца аб беларускае заканадаўства, якое наўрад ці спрыяе прыцягненню ў краіну замежных інвестараў.**



“Нам трэба адкрыць краіну для інвестыцый, замежных і ўнутраных”, — цытуе БелТА Пятра Пракопавіча на семінары Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на тэму “Банкаўская сістэма Рэспублікі Беларусь. Стан, праблемы, перспектывы”. “Нам як паветра патрэбныя вялізныя замежныя інвестыцыі, патрэбны бум замежных інвестыцый”, — падкрэсліў чыноўнік. Для таго, каб Беларусь увайшла ў лік найбольш развітых краін, па словах Пракаповіча, неабходна павялічыць ВУП мінімум у тры разы. Замежныя інвестыцыі мусяць паскорыць гэты працэс.

Таксама кіраўнік Нацбанка лічыць, што ў краіне трэба ствараць новыя галіны, новыя кірункі ў эканоміцы, хуткімі тэмпамі правесці мадэрнізацыю прадпрыемстваў. Новыя кірункі у эканоміцы неабходна стварыць на працягу бліжэйшых 3–4 гадоў. Яны не павінны патрабаваць значных матэрыяльных рэсурсаў, а ў асноўным грунтавацца на чалавечым капітале. Разам з тым Пётр Пракопавіч падкрэсліў, што краіна мусіць развіваць экспартны патэнцыял і ў тых галінах, дзе Беларусь мае ўласную сыравінную базу.

Паводле аптымістычнага прагнозу кіраўніка Нацбанка, у 2014 годзе магчыма максімальна выйсці на дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Нагадаю, што сёлета ў студзені-верасні ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года беларускі экспарт тавараў паменшыўся на 43,3 працэнта, а імпарт знізіўся на 34,8 працэнта. У выніку адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі склалася ў памеры 5021 мільён долараў ЗША, што на 776 мільёнаў больш, чым у студзені-верасні мінулага года. Гэту сітуацыю дзяржаўныя чыноўнікі тлумачаць неспрыяльнай кан'юнктурай на знешніх рынках.

Намесніца міністра эканомікі Беларусі Тацціяна Старчанка супакойвае тым, што хранічны дэфіцыт гандлёвага балансу маюць падобныя з нашай краінай дзяржавы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. “Эканоміка краіны можа развівацца даволі працяглы час і пры наяўнасці адмоўнага сальда”, — лічыць намесніца міністра. Аднак фінансава-эканамічны крызіс выявіў слабасць падобнага падыходу.

Сёлета Беларусь, каб хоць неяк стабілізаваць сітуацыю, была вымушаная нарасціць пазыковы партфель. На працягу 2009 года наша краіна брала пазыкі ад Міжнароднага валютнага фонду (на 1 кастрычніка 2009 года на суму 1466,8 мільёна долараў ЗША), урада Расійскай Федэрацыі (500 мільёнаў долараў ЗША), а таксама экспартныя крэдыты, у тым ліку пад гарантыю ўрада Рэспублікі Беларусь, ад банкаў Кітая, Германіі, Італіі на фінансаванне інвестыцыйных праектаў. Такім чынам, паводле афіцыйнай інфармацыі, па стане на 1 кастрычніка 2009 года знешняя дзяржаўная запазычанасць склала 6 191,2 мільёна долараў ЗША.

Каб выправіць сітуацыю з хранічным адмоўным гандлёвым балансам і, адпаведна, недахопам уласных фінансавых сродкаў, кіраўнік Нацбанка Пётр Пракапові прапануе “адкрыць краіну з пункта гледзішча заканадаўчай базы”. “Да канца года мы павінны прыняць нарматыўныя акты, каб у 2010 годзе Беларусь змагла ўвайсці ў трыццатку краін з найбольш спрыяльным бізнес-кліматам”, — заявіў кіраўнік Нацбанка. Цяпер у агульным рэйтынгу Міжнароднай фінансавай карпарацыі Беларусь знаходзіцца на 58-м месцы, а паводле такога індыкатара як “выплата падаткаў” — на апошнім, 183-м месцы. Беларуская кампанія сярэдняга памеру павінна была праводзіць 107 падатковых выплат, затрачваючы на гэта ў год 900 гадзін (для аналізу браліся звесткі за справаздачны перыяд з чэрвеня 2008 года да чэрвеня 2009 года).

Нягледзячы на такія дадзеныя, Пракаповіч упэўнены, што “ёсць усе магчымасці, каб на працягу бліжэйшых дзесяці гадоў Беларусь выйшла на сярэднееўрапейскі ўзровень жыцця насельніцтва. Па заработнай плаце гэта — не меней 2 тысяч долараў у эквіваленце”. Дасягнуць гэтага, на думку кіраўніка Нацбанка, магчыма за кошт штогадовага эканамічнага росту на 10–12 працэнтаў, павышэння эфектыўнасці працы, выхаду на дадатнае сальда знешняга гандлю. Найбольш пытанняў у цяперашніх умовах выклікаюць запланаваныя паказчыкі росту ВУП.

Краіна знаходзіцца ў рэцэсіі, і сёлета замест традыцыйных дзесяці працэнтаў Мінэканомікі плануе дасягнуць хаця б да паказчыка росту ў 0–2 працэнты. Хаця кіраўнік дзяржавы ў жніўні 2008 года зацвердзіў прагноз росту ВУП на ўзроўні 10–12 працэнтаў. Міжнародны валютны фонд больш цвяроза глядзіць на праблемы з разгрузкай беларускіх складоў і чакае сёлета паніжэння ВУП Беларусі на ўзроўні 1,2 працэнта і рост у 2010 годзе толькі на 1,8 працэнта.

Што тычыцца непасрэдна інвестыцыйнага клімату, які, уласна, і мусіць спрыяць таму “буму замежных інвестыцый”, што мроіцца Пракаповічу, то з ім ёсць некаторыя праблемы. Мінэканомікі Беларусі паведаміла, што завяршыла працу над праектам дакумента, які вызначае парадак надавання статусу інвестыцыйнага агента. Асобныя пункты гэтага дакумента выклікаюць нямала пытанняў адносна таго, якімі інструментамі ўрад плануе заманьваць інвестараў.

Паводле праекта, статус інвестыцыйнага агента змогуць атрымаць асобы, якія валодаюць практычнымі навыкамі падрыхтоўкі інвестыцыйных праектаў да рэалізацыі, а таксама тыя, хто валодае асабістымі дзелавымі якасцямі, якія дазваляюць ім весці перамовы з высокім кіраўнічым складам буйных кампаній. Якім чынам будзе вызначацца ўзровень кампетэнцыі агента — не вядома. А пункт аб пацверджанні “наяўнасці практычнага досведу працы кандыдата ў агенты з інвестыцыйнымі праектамі” закрые дарогу маладым бізнесоўцам, якія захацелі б ступіць на няпросты шлях супрацоўніцтва з Беларуссю.

Таксама ў дакуменце ёсць патрабаванні да інвестыцыйнага агента два разы на год падаваць у Мінэканомікі справаздачу аб зробленай працы, а таксама заключаць асобныя дамовы па кожнаму інвестыцыйнаму праекту, што, несумненна, будзе спрыяць бюракратызацыі працэсу. Да ўсяго Беларусь не плануе аплачваць паслугі інвестыцыйных агентаў, што прымусіць іх найперш працаваць на карысць інвестара, а не беларускай дзяржавы.

РЭФОРМЫ

# ТОЛЬКІ ВЕКТАР, АЛЕ НЕ ДЗЕЯННЕ

Вольга Хвоін

**У абмен на фінансавую дапамогу ў 2009 годзе МВФ запатрабаваў ад Беларусі выканання пэўных умоў, у тым ліку лібералізацыі эканомікі. Праграма лібералізацыі прадугледжвае меры па ўзмацненню пазіцый прыватнага сектара ў беларускай эканоміцы праз рэфармаванне падатковай сістэмы, аплаты працы, цэнаўтварэння, паслабленне дзяржаўнага кантролю і ўплыву на вытворчыя прадпрыемствы. Аднак у шэрагах прадпрымальнікаў адгульнай думкі пра тое, што перамены маюць грунтоўны характар, няма.**



Як ні банальна, але найперш дробныя прадпрымальнікі звяртаюць увагу на праблемы, якія справакаваў крызіс. Абвастрэнне сітуацыі ў фінансавым сектары прывяло да скарачэння крэдытных ліній для малога бізнесу. Паралельна пагоршыліся справы ў буйных прадпрыемстваў, якія працуюць з дробным бізнесам.

“Дзяржаўны бізнес не лічыў для сябе раўнапраўным партнёрам бізнес прыватны. Ён дазваляў сабе і дазваляе сёння разлічвацца з дробнымі прыватнікамі па рэштаваму прынцыпу, — тлумачыць старшыня каардынацыйнай рады Саюза юрыдычных асоб “Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва” Уладзімір Карагін. — То бок, калі буйное прадпрыемства змяшчае замову ў буйнога прадпрыемства, яно разлічваецца. Суцэльна бачым сітуацыю, калі буйныя прадпрыемствы не вяртаюць грошы за выкананыя працы суб'ектам малога бізнесу”.

Найбольш гэта характэрна для жыллёва-камунальнай сферы і будаўніцтва. Таксама ў шэрагу балючых кропак Карагін называе барацьбу з імпартам, што справакавала спыненне шэрагу тэндэраў і закупак.

У такіх умовах найперш рады трэба шукаць праз інструменты заканадаўства. Аднак таго, што ўводзіцца цяпер у сілу, яўна недастаткова. “У асноўных накірунках па лібералізацыі эканомікі — 52 пункты, многія з якіх узятыя з нашай Нацыянальнай платформы бізнесу ў Беларусі. Гэта толькі вектар дзеяння. Але ахопу ўсіх праблем, якія варта вырашыць, няма”, — адзначае старшыня каардынацыйнай рады Саюза прадпрымальнікаў.

Паводле яго слоў, неабходны пакет дзейсных мераў: спрашчэнне падаткаабкладання, заканадаўства, скарачэнне розных невытворчых затрат. Варта рабіць стаўку на развіццё малога і сярэдняга бізнесу. “Для гэтага патрэбна пяць мільярдаў рублёў, а выдзяляецца ў пяцьдзесят разоў менш”, — канстатуе Уладзімір Карагін. Вядома, што стварыць новыя рэнтабельныя вытворчасці, як да таго заклікае ўрад, без дадатковага фінансавання немагчыма. У гэтай сувязі эксперт акрэслівае праблему стварэння гарантыйных фондаў: “Пяць год таму было створана заканадаўства па гарантыйных фондах. Аднак за гэты час яны не былі створаныя, а банкі не хочуць даваць грошы дробнаму бізнесу без дадатковых гарантый”.

Шлях да развіцця малога бізнесу, па словах Карагіна, палягае праз агульнае спрашчэнне працэдуры вядзення бізнесу і ўліку дзейнасці. “У нас працуе пяцьсот тысяч бухгалтараў з чатырох мільёнаў эканамічна актыўнага насельніцтва. Кожны восьмы — бухгалтар. Такая складаная сістэма ўліку закранае і спутвае ўвесь бізнес”, — мяркуе старшыня каардынацыйнай рады Саюза прадпрымальнікаў. Замест папяровага кручкатворства прапануецца сканцэнтравацца на інавацыях і тэхналогіях, а дзяржаве працаваць не з цаны, а з абароту, то бок найперш стымуляваць вытворчасць, а не падатковую дзейнасць.

Дарэчы, у Беларусі чакаецца паніжэнне падатку на прыбытак з 24 да 20 працэнтаў. Для кампенсавання страт прыбыткаў бюджэту плануецца падвысіць стаўку падатку на дабаўленую вартасць з 18 да 22 працэнтаў. Такія змены Уладзімір Карагін лічыць “нічым не апраўданымі”. “Падвышэнне фіскальнага падатку, які нічога не стымулюе, аўтаматычна дазволіць чыноўнікам супакоіцца, бо яны змогуць здымаць тую ж суму грошай, што і летась. Ураду трэба працаваць у абсалютна іншым накірунку”, — адзначае спецыяліст.

ГЕАПАЛІТЫКА

# ТРОХКУТНІК ІНТАРЭСАЎ

Вольга Хвоін

**Беларуска-еўрапейскія адносіны — тэма, якая апошні год не сыходзіць са старонак СМІ і турбуе палітолагаў. Аднак і расійскі накірунак пакуль не збіраецца згінуць у Леце. Беларусь у гэтай геапалітычнай канструкцыі заняла месца суб'екта, які праводзіць сваю палітыку насуперак ці дзякуючы тым ці іншым інтарэсам, але ўсё больш зыходзячы з уласных мэтаў.**

## Беларусь, якая адбылася

Як самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне Беларусь даўно адбылася — канстатаваў падчас сустрэчы экспертаў на XII Мінскім форуме дырэктар Маскоўскага цэнтра Карнегі Дзмітрый Трэнін. Далейшы выбар геапалітыкі дзяржавы будзе толькі вагацца ў межах кан'юнктурных інтарэсаў паміж Еўропай і Расіяй. Вынікам двух дзесяцігоддзяў беларуска-расійскіх адносінаў ёсць выснова пра тое, што інтэграцыя гэтых дзяржаў больш не актуальная. А беларускі рэжым вельмі нязручны паводле сваёй сутнасці для расійскіх дамоваў.

"Беларусь — гэта дзяржава, якая ўжо адбылася. Прычым даволі своеасаблівым і нават іранічным спосабам. Той чалавек, які высунуў канцэпцыю Саюзнай дзяржавы, каб стаць яе кіраўніком, затым выкарыстоўваў яе на працягу наступнага дзесяцігоддзя, каб атрымліваць датацыі, — гаворыць расійскі эксперт. — Тая воля да ўлады, якая была і ёсць у гэтым чалавеку, стварыла канкрэтны рэжым, і яна ж дабавіла суверэнітэту краіне. То бок суверэнітэт Беларусі — прадукт улады чалавека, які кіруе дзяржавай".

Тое, што Беларусь цяпер актыўна асвойвае шматвектарную палітыку, па словах Дзмітрыя Трэніна, абсалютна нармальна. Удзел у праграме "Усходняе партнёрства" не з'яўляецца новым курсам, ён толькі выкрыў рэальныя памкненні афіцыйнага Мінска. Беларусь не ўваходзіць у сферу інтарэсаў Расіі з-за сваёй нелаяльнасці да палітычных элітаў усходняй суседкі і немагчымасці кіраваць унутранымі беларускімі падзеямі з Масквы. Цяперашнюю Расію эксперт вызначае як нашчадка імперскай краіны, аднак з карэкціроўкай на сучасныя рэаліі.

"Расія — постімперская краіна, якая цяпер імкнецца сябе зацвердзіць як вялікая дзяржава. І ў гэтай якасці яна прэтэндуе на тое, каб стаць цэнтрам сілы, з вызначанай зонай уплыву. Аднак гэта зона ўплыву не ёсць нейкім аналагам Варшаўскай дамовы ці, тым больш, Расійскай імперыі. У палітычнай сферы гэта — лаяльныя дзяржавы, ці, прынамсі, дзяржавы, якія не ўступаюць у NATO, а ў лепшым выпадку ўступаюць у АДКБ. Што тычыцца эканомікі, то гэта не столькі інтэграцыя, колькі прадстаўленне ўмоў расійскаму капіталу для эканамічнай экспансіі", — адзначае Дзмітрый Трэнін.

Паводле яго слоў, еўрапейскі вектар сёння прадугледжвае перспектывы інтэграцыі, расійскі — вяртанне да традыцыі ранейшых узаемаадносін. "Расія насамрэч не прапануе інтэграцыйны праект, бо разумее, што за любую інтэграцыю нехта мусіць плаціць. За інтэграцыю Еўропы ў многім заплаціла Заходняя Германія. Расія не хоча яшчэ раз плаціць за гэта, нават калі яна будзе лідэрам інтэграцыі", — лічыць дырэктар Маскоўскага цэнтра Карнегі.

Стрымана аптымістычны прагноз адносна развіцця беларуска-расійскіх адносінаў прагучаў і з вуснаў кіраўніка Цэнтра міжнародных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта Уладзіміра Улаховіча, разам з тым эксперт робіць акцэнт на "натуральнасці" шматвектарнасці знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

"Цяпер распаўсюджана меркаванне, што ўзаемаадносіны Беларусі і Расіі перажываюць крызіс. Эмацыйны бок справы зразумелы, аднак узровень гэтых адносінаў застаецца такім высокім, як ні на любым іншым накірунку, — падкрэслівае Улаховіч. — Шырока распаўсюджана меркаванне, што Беларусь сыходзіць на Захад, іграе ў нейкую гульню, каб дабіцца эканамічных прэферэнцый. І нават гаворыцца, што Беларусь здзяйсняе стратэгічнае адступніцтва. Я думаю, усё гэта перабольшванне. Развіццё беларуска-еўрапейскіх адносінаў — натуральная карэкцыя знешнепалітычнага курса краіны, і менавіта так трэба да яго ставіцца". Па словах эксперта, кожнаму мусіць быць зразумела, што будаваць нацыянальную дзяржаву па прынцыпу адчужэння аднаго вектара — неразумна і нерэальна, а развіццё паўнавартасных, фундаментальных адносінаў з Еўропай — частка нацыянальных беларускіх інтарэсаў.



## Інтарэс купюр

Грунт пазітыўнага ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі павінен палягаць у эканамічнай плоскасці. "Ёсць пазіцыя, паводле якой еўрапейскі вектар павінен стаць магістральным у міжнароднай палітыцы Беларусі. Я не думаю, што сёння можна выдаляць стратэгічнае партнёрства з Расіяй, — адзначае кіраўнік Цэнтра міжнародных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта Уладзімір Улаховіч. — Справа не ў кан'юнктуры, гэта аб'ектыўная рэальнасць. Адбудоўваць гэта стратэгічнае партнёрства так ці інакш давядзецца, бо адчужэнне на Захадзе ці Усходзе не ў нацыянальных інтарэсах. Іншая справа, што супрацоўніцтва трэба напоўніць іншай якасцю".

Улаховіч лічыць, што канфлікты з Расіяй абумоўленыя заідэалагізаванасцю і жаданнем аднавіць Савецкі Саюз. "Гэта сыграла супраць саюзнага праекта, бо цяперашнія рэаліі былі забытыя. Напрыклад, суверэнітэт. Для нас гэта не выклікае сумневаў, а ў расійскага боку стаўленне іншае". Разыходжанне поглядаў на партнёрства эксперт бачыць у мадэлях існуючых палітычных эліт і культываванні розных каштоўнасцяў.

"Дзяржаўна-эканамічны капіталізм алігархічнага тыпу, які пабудаваны ў Расіі, усё ж не прымальны для Беларусі. Беларуская мадэль, як бы да яе ні ставіліся і ні іранізавалі на гэты конт, мае права на існаванне. Адзін нямецкі журналіст назваў яе "інтуітыўным сацыялізмам". Я думаю, што гэта інтуіцыя палітычнага кіраўніцтва ў пабудове саюзнай мадэлі супадала з уяўленнем сярэдняга беларуса пра тое, як мусіць выглядаць дзяржава. Рознасць гэтых укладаў — той бар'ер, які перашкаджае будаваць прагматычную лінію супрацоўніцтва, асабліва па лініі гаспадарчых сувязяў", — рэзюмуе кіраўнік Цэнтра міжнародных даследаванняў БДУ.

Аднак перспектывы беларуска-расійскіх адносінаў, паводле яго меркавання, станоўчыя. І не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае паляпшэнне стасункаў паміж ЕС і нашай усходняй суседкай. "У якасці пазітыўных прынцыпаў я б хацеў назваць змяненне агульнай танальнасці ва ўзаемадзеянні Расіі і Захаду, — тлумачыць Уладзімір Улаховіч. — Гэта важны момант, які можа сыграць сваю ролю ў развіцці беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва і стратэгічнага партнёрства з Расіяй. Другое — гэта рэформы, якія павoлі адбываюцца ў Беларусі. Так, гэта асцярожныя, няспешныя рэформы, але, калі яны будуць паступовымі і дадуць новую якасць, то, магчыма, і не патрэбна хуткасць, пра якую цяпер гаворыцца".



Той факт, што Расія не змагла заняць важнейшыя пазіцыі ў беларускай эканоміцы праз прыватызацыю, паводле трактоўкі дырэктара Маскоўскага цэнтра Карнегі Дзмітрыя Трэніна, для Масквы ёсць праблемай, бо гэта не ўпісваецца ў створаную мадэль ідэальных адносінаў. Аднак эксперт не падзяляе думкі, што Беларусь знаходзіцца ў сферы ўплыву Расіі.

"Некаторыя гавораць, што Масква стварае нейкі аўтарытарны інтэрнацыянал, маўляў, з аўтарытарнымі кіраўнікамі лягчэй дамаўляцца. Прыклад Беларусі паказвае, што зусім не так. Маскве прасцей дамаўляцца з плюралістычнымі лідэрамі Украіны, у якіх свае інтарэсы, і на іх можна і патрэбна гуляць любой дзяржаве, што клапоціцца пра свае нацыянальныя інтарэсы. У адносінах да Беларусі гэта не атрымліваецца", — робіць высновы Трэнін.

Прычыны "нязмоўнасці" палягаюць у абмежаваных магчымасцях для ціску, адсутнасці свабоды для манеўраў на беларускім палітычным полі, бо яно "асфальтаванае", а сама формула адносінаў "датацыі ў абмен на дэманстрацыю лаяльнасці" больш выгодная для Мінска, чым для Масквы. "На мой погляд, Беларусь адназначна не ўваходзіць у сферу ўплыву Масквы. Сёння гэта толькі два ўтварэнні — Абхазія і Паўднёвая Асеція, усё астатняе — абсалютна не сфера ўплыву, гэта дзяржавы са сваімі інтарэсамі", — рэзюмуе палітолаг.

## На трое бабка варажыла

Сённяшняя сітуацыя манеўравання Беларусі з пошукам партнёраў і спонсараў па заходні і ўсходні бакі дзяржаўнай мяжы больш-менш зразумелая. У будучым эксперты прагназуюць некалькі варыянтаў развіцця адносінаў у трохкутніку "Еўрасаюз — Беларусь — Расія".

Напрыклад, у ЕС лічаць, што змена беларускай палітыкі ў заходнім накірунку была прадыктаваная пераменамі беларуска-расійскіх адносінаў. "Інтэграцыя Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі мае павярхоўны характар. З гэтага вынікае, што будучыня беларуска-расійскага праекта зусім не ясная", — адзначае навуковы супрацоўнік Інстытута даследавання праблем бяспекі Сабіна Фішэр (Парыж).

Аднак яна гаворыць, што для далейшага развіцця Беларусі неабходна збліжэнне з ЕС, адносіны Беларусі і Расіі могуць развівацца паралельна. Спадарыня Фішэр даволі аптымістычна глядзіць на здольнасці палітыкаў прадбачыць канфліктныя сітуацыі і, адпаведна, жыць у згодзе, карыстаючыся новымі магчымасцямі, якія адкрывае Еўропа. "Адносіны паміж Еўрасаюзам і Беларуссю за апошнія пятнаццаць гадоў набылі спецыфічную афарбоўку. Гэта адзіная краіна, якая мае санкцыі з боку ЕС, праблема зрушылася толькі пасля леташняй расійска-грузінскай вайны. Я думаю, што ўнутры ЕС дасягнутая згода адносна таго, што мусіць быць больш пазітыўных зменаў і ў канчатковым выніку інтэграцыя. Еўрасаюз з Беларуссю маюць шанец усталяваць унутраны кансенсус", — перакананая эксперт.



Найбольш верагодным сцэнарам развіцця падзей дырэктар Маскоўскага цэнтра Карнегі Дзмітрый Трэнін называе захаванне цяперашняй тэндэнцыі — паглыбленне суверэнітэту Беларусі, збалансаванне адносінаў з Расіяй і Еўропай, павярхоўную і нетрывалую інтэграцыю з Расіяй.

"Мытны саюз магчымы, аднак наўрад ці атрымаецца стварыць агульную гандлёвую прастору з-за рознасці эканомікі. Замена саюзу — стратэгічнае партнёрства", — падкрэслівае эксперт. Другі варыянт развіцця абумоўлены разваротам Мінска ў бок Еўропы, калі дэмакратызацыя зробіць заходні вектар вызначальным, а мадэрнізацыя краіны пойдзе праз інтэграцыю. Расіі застанецца толькі роля суседкі. Паводле магчымага трэцяга сцэнару развіцця падзей (Трэнін назваў яго найменш верагодным), у Маскве прыйдуць да высноў, што галоўнае для Беларусі — мадэрнізацыя, а не размовы пра яе, што гэта важней за статус. Бо калі не будзе мадэрнізацыі, то краіна стане перыферыяй і Еўропы, і Азіі. "Наступнай будзе тэза: "Еўропа — важнейшы знешні рэсурс мадэрнізацыі краіны", бо самастойна здзейсніць гэта Расія не зможа. Тады Расія з задавальненнем, я лічу, зменіць сваю палітыку, задзейнічае інструменты "мяккай сілы", не будзе размоў пра сферы ўплыву, хаця самога ўплыву можа быць і больш", — прагназуе эксперт.

З НАГОДЫ

# РЭЛЯТЫВІСЦКАЯ МАРАЛЬ

Аляксей Хадыка

**За некалькі дзён да Дзядоў і традыцыйнага грамадскага ўшанавання прадстаўнікамі дэмакратычнай грамадскасці ахвяраў масавых расстрэлаў у Курапатах галоўнае афіцыйнае выданне Беларусі “СБ. Беларусь сегодня” досыць нечакана звярнулася да тэмы рэдакцыйным артыкулам Паўла Якубовіча, дапоўненым матэрыяламі “круглага стала”.**

Публікацыя, натуральна, выклікала жывую рэакцыю ў незалежных СМІ і беларускай блогасферы, часам даволі скептычную: варта было прайсці 21 году з часу публічнага раскрыцця жудаснай трагедыі ў артыкуле Зянона Пазняка і Яўгена Шмыгалёва “Курапаты — дарога смерці”, каб “СБ” заклікала да пакаяння, замірэння бакоў і шанавання месца, якое ўжо даўно зрабілася народным мемарыялам. Выснова газеты: “Агрэсіўныя дактрыны, якія б высакародныя мэты яны ні дэкларавалі, калі вядуць да пагібелі людзей — амаральныя”. Адмаўленне праўды названае “шматгадовым змрочным спектаклем”, а сведчанні фіктыўных “відавочцаў” пра забіццё ў Курапатах не нашых суграмадзян, а “гамбургскіх яўрэяў” — “кашчуннымі”.

Праўда, многія каментатары не хаваюць сумневу наконт успрыняцця публікацыі як знака павароту дзяржаўнай палітыкі да ацэнкі мінулага з пункту маральнасці, гуманізму і гістарычнай праўды. Вельмі свежы ўспамін пра тое, як з’яўленне ў “СБ” матэрыялаў дыскусіі па гісторыі Беларускай народнай рэспублікі напярэдадні яе 90-годдзя не зашкодзіла чарговаму брутальнаму разгону Дня Волі–2008. Між тым, тая папярэдняя дыскусія ў “СБ” заканчвалася аналагічнымі заклікамі ініцыятара: “не шукаць у нашай гісторыі “болевых кропак”, а бачыць галоўнае, што мусіць яднаць беларусаў перад новымі выклікамі часу XXI стагоддзя”. Ці не з’яўляецца факт чарговай ініцыятывы “СБ” дэманстрацыяй “гуманізацыі” палітычнага аблічча сістэмы навонкі, для дэмакратычнай Еўропы ў большай ступені, чым дзеяннем унутранага карыстання?

Аўтар артыкула заклікае да ўсеагульнага ўзаемнага прымірэння: сучасная Беларусь — не спадчынніца СССР у частцы здзейсненых у сталінскую эпоху злачынстваў, ахвяры рэабілітаваныя, катаў не засталося. Спынім супрацьстаянне, адмовімся ад “палітызацыі” гісторыі, ператворым Курапаты ў месца народнай памяці, а не мітынгаў. Іначай, з прыхаванай пагрозай гучыць выснова, грамадства прыйдзе да новых Курапатаў.

Па чытанні тэксту ўзнікае, аднак, больш пытанняў, чым пазітыву. І справа тычыцца не толькі сумнеўнага сцверджання, што ўсе ахвяры масавых сталінскіх рэпрэсій рэабілітаваныя. Неяк незнарок разважанні аўтара і ход дыскусіі, у якой бралі ўдзел навуковы кіраўнік мемарыяльнай зоны “Курапаты” Мая Кляшторная, палітык Андрэй Клімаў, ксёндз Ігар Лашук, загадчык цэнтра Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Мікалай Смяховіч, а мадэратарам выступаў Павел Якубовіч, павярнуліся да спрэчнай тэзы: мемарыялізацыя Курапатаў — справа грамадская, а не дзяржаўная. Да гэтага схілялі двое апошніх. Ці не таму, што дзяржава да ўдзелу ў сімвалічным акце пакаяння яшчэ не даспела, і ёй паранейшаму бліжэй кампліментарнае стаўленне да сталінскай эпохі, увасобленае ў помніках кшталту “Лініі Сталіна”?

Былі ў праграмы і праблемы. У 1970 годзе дзяржаўная камісія штату Місісіпі прагаласавала за забарону трансляцыі “Вуліцы Сезам”. Чыноўнікам не спадабалася, што



шоу вядуць як белыя, так і чарнаскурыя. Калі ў справу ўмяшаліся людзі з Вашынгтона, камісія заявіла, што прагляд “Вуліцы Сезам” выклікае ў дзяцей эпілепсію. У сярэдзіне 1990-х праграму атакавалі феміністкі, якія палічылі, што яна дапамагае кансервацыі




стэрэатыпаў пра месца і паводзіны жанчыны ў грамадстве.

Легенда “Вуліцы Сезам” працягваецца на нашых вачах. 10 лістапада выпуск праграмы пачаўся як звычайна: лялька-пачвара Елмо і Вялікая Птушка вялі чарговую размову. Тут нечакана ў кадры з'явілася Мішэль Абама. Яна прыйшла з прадуктамі са свайго агароду. Мішэль паказала лялькам памідоры, бульбу і агуркі, якія вырасціла на палянцы перад Белым домам.

“Я люблю агуркі. Цяпер на вуліцы Сезам будзе выключна здаровая ежа”, — сказала яна і падаравала гародніну лялькам. На гэта Вялікая Птушка адказала Мішэль: “Я і ты — мы абодва вялікія. Магчыма, мы з адной сям'і”. “Натуральна”, — адказала першая лэдзі і звярнулася да маленькіх гледачоў з прамовай пра тое, што выключна чыстыя і свежыя садавіна і гародніна дапамогуць ім вырасці вялікімі.

Мішэль Абама глядзіць “Вуліцу Сезам” з пяці гадоў і працягвае глядзець зараз кожны дзень са сваімі дочкамі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Менавіта альянс Кіева і Мінска дапамог бы і Расіі, і Украіне, і Беларусі адыйсці ад карпаратыўных схем у пастаўках энерганосьбітаў, выпрацаваць зразумелую палітыку і па транзітных коштах на пастаўкі энерганосьбітаў у Еўропу... Менавіта гэтага, верагодна, і баяцца ў Маскве, калі з такім раздражненнем кажуць пра прыезд Аляксандра Лукашэнкі ва ўкраінскую сталіцу. Менавіта такая схема, якая раз і назаўжды паставіць кропку на таемных дамовах адносна паставак расійскага газу, можа паставіць кропку і на схемах адкатаў. Гэта з'яўляецца смяротнай пагрозай для ўсёй расійскай палітычнай і бізнесовай сістэмаў.

**“Радио Свобода” (Расія).**

Угэтай “цёплай” кампаніі сяброў (Юшчанка і Лукашэнка) бракуе толькі Саакашвілі. Але ён у хуткім часе з'явіцца на гарызонце. Ёсць нагода. У беларускім парламенце створана група па падрыхтоўцы пытання пра прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ў якасці незалежных дзяржаў. Гэта інфармацыя сведчыць усяго толькі пра пачатак чарговага этапу спекуляцый на каўказскім пытанні, а не пра намер прызнаць новыя дзяржавы. Падазрэнні пацвердзіліся пасля публікацыі першага паведамлення. Услед за ім з'явілася другое. Кіраўнік камісіі па міжнародных справах парламента Беларусі Сяргей Маскевіч заявіў, што пытанне пра прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ў павестцы дня да канца 2009 года наўрад ці з'явіцца!

**“Коментарии.ру” (Расія)**

Хоць у свой час Галіцка-Валынская княства кантралявала вялікую частку тэрыторыі Беларусі, Украіна прызнае яе дзяржаўнасць. Ніякіх прэтэнзій з нашага боку не можа гучаць. Тым больш, такіх прэтэнзій не можа гучаць з боку Беларусі. У нас ёсць агульныя праблемы, падобная структура эканомікі, даволі блізкія адносіны з Еўрасаюзам. Для Беларусі Украіна з'яўляецца ідэальным вялікім суседам, які не парушае яе суверэнітэт. Гэта там адчуваюць.

**“Форум” (Украіна)**

У Беларусі ў спешным парадку рыхтуюцца змены ў Выбарчы кодэкс. Як адзначалася на нарадзе ў прэзідэнта, папраўкі ў законы не запатрабуюць унясення змен у Канстытуцыю і правядзення рэферэндуму. Аднак яны будуць радыкальнымі, што дазволіць беларускаму заканадаўству адпавядаць заходнім стандартам.

**“Российская газета” (Расія)**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, якога яшчэ нядаўна ўспрымалі як “апошняга дыктатара Еўропы”, дэманструе віртуозную дыпламатыю. Ён і не хавае, што мае намер застацца на двух крэслах — атрымліваць крэдыты з Масквы і ісці насустрач Еўропе. Таму і адносіны Беларусі з Расіяй і еўрапейскімі дзяржавамі складаюцца па прынцыпе маятніку — то гарачае каханне, то замаразкі.

**“Грузия сегодня” (Грузія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІСПАНІЯ. ФІЛАСОФІЯ СІМПСАНАЎ




Гэтымі днямі спаўняецца 20 гадоў з моманту з'яўлення на экранах мультыплікацыйнага серыялу "Сімпсаны". Барселонскае выданне "Blackie Books" вырашыла зрабіць свой унёсак у юбілей, выдаўшы зборнік "Сімпсаны і філасофія". Яго аўтары паспрабавалі падсумаваць паводзіны, ідэйныя каштоўнасці і нават сексуальныя комплексы прадстаўнікоў сям'і Сімпсанаў ды скласці з іх нейкую дактрыну. Па-сутнасці, каштоўнасці сям'і Сімпсанаў — гэта далёка не каштоўнасці сярэдняй амерыканскай сям'і, кажуць ініцыятары праекту. Клуб прыхільнікаў Сімпсанаў, і перш за ўсё яго галоўнага персанажа — бацькі сямейства Гамера Сімпсана, — налічвае сотні мільёнаў па ўсёй планеце. Напрыклад, 22 працэнты маладых брытанцаў кажуць, што хацелі б жыць у сям'і Сімпсанаў. Прааналізаваўшы ўсе серыі, аўтары вырашылі, што Сімпсаны карыстаюцца ў паўсядзённым жыцці як мінімум такімі філасофскімі тэорыямі. Гамер Сімпсан — несвядомы прыхільнік парадоксаў Арыстоцеля і класавай тэорыі Карла Маркса. Яго жонка — аматар Канта. Сын Барт — латэнтны ніцшэанец. Нарэшце, маленькая дачка Ліза — прадстаўнік новых левых. Хаця яе роля ў серыяле, на думку аўтараў зборніка, больш важная. У сям'і да яе ўсе ставяцца вельмі асцярожна, тым самым дэманструючы насцярожанасць працоўнай і правінцыйнай Амерыкі да інтэлігентаў.

**Па матэрыялах "El Pais" (Іспанія)**

### ЛІВАН. ДЗЁННІК ГАННЫ ФРАНК ЗРОБЯЦЬ МЕНШ ЭМАЦЫЙНЫМ



Рух ісламскіх фундаменталістаў "Хезбалах" дабіўся ўнясення зменаў у тэкст фрагментаў дзённіка Ганны Франк — яўрэйскай дзяўчынкі, якая падчас акупацыі апісала жудасці Халакосту ў Нідэрландах. Частку таго дзённіка маладыя ліванцы некаторых прыватных школ вывучалі ў рамках курса агульнай гісторыі. На думку ісламістаў, гэты дзённік у цяперашнім выглядзе — не што іншае, як рэклама сіянізму. "Al-Manar" — тэлевізійны канал "Хезбалах" — разгарнуў кампанію за забарону або за цэнзуру тэксту дзённіка, паколькі "манера падача думкі ў ім занадта эмацыйная, драматычная і тэатральная". На думку "Al-Manar", у выпадку захавання дзённіка ў школьнай праграме, Ліван стане "плацдармам сіянізму ў адукацыі". Дырэктар дэпартамента адукацыі Лівана, які адказвае за прыватныя школы, заявіў, што выдаў інструкцыю для ўстаноў часова прыпыніць вывучэнне дзенніка, як мінімум да ўнясення адпаведных зменаў.

**Па матэрыялах "Le Monde" (Францыя)**

### МАЛДОВА. ЦІ БУДЗЕ ПОМНІК ГЕТМАНУ



Прыднястроўскія ўлады негатыўна паставіліся да прапановы сакратара Савета Бяспекі Украіны Раісы Багатыровай усталяваць у Бендэрах (Прыднястроўе) помнік гетману Мазепе. Менавіта ў Бендэрах Мазепа памёр увосень 1709 года пасля таго, як збег сюды са шведскім каралём Карлам пасля паразы пад Палтавай. 300-я гадавіна смерці гетмана падштурхнула мясцовую грамаду украінцаў выступіць з ініцыятывай стварэння помніка Мазепе. Ідэю падтрымаў афіцыйны Кіеў. Рэакцыя афіцыйнага Цірасполю была вельмі адмоўнай. На думку прыднястроўскага ўрада, такая прапанова — юрыдычны казус, паколькі Украіна афіцыйна не прызнала Прыднястроўе. Праўда, непасрэдна супраць помніка Мазепе прыднястроўскія ўлады не выступаюць. Яны лічаць, што Мазепа павінен быць выяўлены ў труне, што стане сімвалам лёсу здрадніка. Між тым, ва ўсёй гэтай гісторыі ёсць цікавая акалічнасць. Раіса Багатырова — адзін з былых лідэраў Партыі рэгіёнаў, якая доўгі час змагалася супраць рэабілітацыі Мазепы.

**Па матэрыялах "Голос Одессы" (Украіна)**

КАМЕНТАР

# ЧЭРАП ХАНА

*Алег Пятроў*

**Нурсултан Назарбаеў не любіць старажытных казахскіх ханаў. Падставай падазраваць прэзідэнта ў гэтым стала нядаўняе адкрыццё архітэктурнага ансамбля «Казах елі», на які сабралі больш за 70 тысяч чалавек.**



Помнік сам па сабе скандальны: на барэльефе "па просьбах працоўных" выяўлена скульптура прэзідэнта Нурсултана Назарбаева. Аднак крытыкаў рэжыму зацікавілі іншыя аспекты свята. Першапачатковая ідэя ансамбля была іншай: каля калоны павінны былі знаходзіцца скульптуры ханаў Жанібека і Керэя — заснавальнікаў казахскага ханства, якое было створана ў XV стагоддзі. Помнікі нават замовілі ў Кітаі. Увесну 2008 года бронзавыя статуі даставілі ў Астану, каб потым… выкінуць на пустыр на ўскрайку горада. Жанібек і Керэй валяюцца сёння пасярод стэпу. Улады не хаваюць, што батырам не знайшлося месца ў "Казах елі" з той прычыны, што "канцэпцыя змянілася".

"Атрымліваецца, што подзвігі ханаў — дробязь у параўнанні з заслугамі Назарбаева. Сорам. Ганьба", — пісаў на форуме аднаго інтэрнэт-выдання нейкі раз'юшаны гісторык. Аднак гэта быў толькі пралог. На хвалі скандалу апазіцыя абвінаваціла адміністрацыю Назарбаева ў тым, што яна сабатуе працэс пошукаў чэрапа хана Кенесара.

Хан Кенесар — апошні з казахскіх ханаў. Ён стаў ініцыятарам паўстання 1838 года — самага буйнога паўстанне казахаў супраць расійскай каланізацыі. Сімвалічна, што бунт пачаўся з таго, што казахі спалілі Акмалінскі форт — месца, дзе сёння знаходзіцца Астана. У 1841 годзе прадстаўнікі трох казахскіх родаў абралі Кенесара ханам.

Лічыцца, што падчас кульмінацыі паўстання армія Кенесара складала каля 20 тысяч чалавек. У 1844 годзе паўстанне набыло такі маштаб, што Санкт-Пецярбург быў вымушаны накіраваць сюды вайсковую экспедыцыю. "У адной дзяржаве не можа быць двух манархаў", — сказаў імператар Мікалай I, падпісваючы загад на адпраўку войскаў.

Аднак забілі хана не рускія, а кіргізы. Пад ціскам расійскіх войскаў Кенесар накіраваўся ў 1847 годзе ў Кіргізію. Кіргізская манапы (князі) адмовіліся падпарадкоўвацца захопнікам, тым больш, што ім абяцалі падтрымку рускія. Да гэтага часу не вядома, як хан трапіў у палон да кіргізаў. Адны крыніцы кажуць, што ў выніку няўдалага бою, іншыя — што правадыра казахаў падманулі, запрасіўшы на перамовы.

Пасля цела хана было разарванае на часткі. Чэрап нябожчыка кіргізы вырашылі перадаць рускім у якасці сувеніра. Трафей даставілі ў Омск генерал-губернатару Гарчакову. Пасля, па легендзе, быццам перадалі ў кунсткамеру ў Санкт-Пецярбург.

Тут пачынаецца самае дзіўнае. Ёсць шмат людзей, якія кажуць, што асабіста бачылі чэрап. Між тым, адміністрацыя Эрмітажа сцвярджае, што чэрапа Кенесара ў іх няма, паколькі анатамічнай каштоўнасці ён не мае. Варыянт знікнення экспаната кіраўніцтва Эрмітажа радыкальна адмаўляе.

Пакуль вучоныя шукалі галаву Кенесара, ягоная мара споўнілася — Казахстан стаў незалежнай дзяржавай. Паўстанне 1838 года перасталі трактаваць як бунт буйных феадалаў (у савецкіх падручніках мяцеж Кенесара звязвалі з прыняццем статуту 1822 года, які пазбаўляў арыстакратаў былых правоў). Сам Кенесар стаў нацыянальным героем. У Астане ў 2001 годзе яму быў адкрыты помнік. Адначасова казахскія дыпламаты праз консульства ў Санкт-Пецярбургу накіравалі ў Эрмітаж ліст з просьбай вярнуць экспанат на радзіму. Адтуль прыйшоў тыповы адказ, што ніякага чэрапа ў фондах кунсткамеры няма.

Аднак у кунсткамеры ёсць чэрап іншага казахскага героя — Нурмагамбета Какембайулы, вядомага як батыр Кейкі. Кейкі быў адным з лідэраў антыцарскага паўстання 1916 года. Калі ў 1926 годзе сталіца Казахстана пераязджала з Арэнбурга, чэрап чамусьці перадалі на часовае захаванне ў тую ж кунсткамеру.

Пасля атрымання незалежнасці казахі прасілі вярнуць і гэты чэрап батыра на радзіму. Эрмітаж адпісаў, што можа разглядзець падобную просьбу ў выпадку, калі да іх звернуцца родныя і нашчадкі Кейкі. Тыя так і зрабілі, аднак чэрап іхняга славутага прашчура дасюль знаходзіцца на берагах Нявы.

Існуе версія, што чэрап Кенесара так і застаўся ў Омску. Дарэчы, адным з тых, хто яго бачыў, быў родзіч Чокана Валіханава — будучага вядомага навукоўца. На той момант ён быў курсантам кадэцкага корпусу ў Омску.

Так ці інакш, гісторыя са скульптурамі ханаў зноў прыцягнула цікавасць да Кенесара і яго чэрапа. Чэрап набывае сімвалічнае значэнне ў сучаснай казахскай палітыцы. Усім вядома, што Назарбаеў носіцца з ідэяй перадаць уладу свайму трохгадоваму сыну Султану. Лепшая формула для рэалізацыі такога плану — стварэнне ў краіне мадэлі канстытуцыйнай манархіі. Але што ў такім выпадку рабіць са старымі арыстакратычнымі родамі, якія маюць куды больш правы на манаршы трон? Адсюль, быццам, і нелюбоў прэзідэнта да ханаў. І, натуральна, вяртанне чэрапа Кенесара толькі ўзмоцніць цікавасць да роду Чынгізідаў.

Праўда, існуе і іншая версія. Ёсць думка, што Расія баіцца аддаваць, а Астана прымаць чэрап Кенесара, паколькі гэта адразу справакуе выбух антырасійскіх настрояў. Усё таму, што з чэрапа ворага, як патрабуе азіяцкая традыцыя, часта рабілі кубкі. Магчыма, такая ж доля выпала і галаве хана.

АЎТАНОМІЯ



# НОВАЕ КОСАВА

Алег Новікаў

**Правінцыя Ваяводзіна вяртае сабе статус аўтаноміі. Ці стане гэта пачаткам чарговага этапу развалу Сербіі?**

Ваяводзіна знаходзіцца на поўначы Сербіі. Да развалу Югаславіі яна ўваходзіла ў Сербію і адначасова мела статус аўтаномнай вобласці. Такія ж правы мела Косава на поўдні.

Прычыны, каб надаць правінцыі асаблівы адміністратыўны статус, звязаныя з вельмі стракатым складам насельніцтвам (тут жывуць венгры, сербы, харваты) і асаблівасцямі гісторыі краю.

Да першай сусветнай вайны Ваяводзіна ўваходзіла ў склад Аўстра-Венгрыі. Калі ў 1848 годзе пачалася "вясна народаў", сербы Ваяводзіны абвясцілі пра стварэнне сербскай аўтаноміі ў складзе імперыі. Вена спачатку спрабавала гуляць з сербамі. Край быў абвешчаны маёмасцю кароны, а імператар уключыў у свой тытул прозвішча "Вялікі ваявода Сербскай Ваяводзіны". Аднак у 1860 годзе забаўка перастала цікавіць аўстрыйцаў. Ваяводзіна стала часткай правінцыі Банат.

Пасля падзення Аўстра-Венгрыі краіны Антанты падзялі падзел яе тэрыторый. Частку Баната прыбрала Румынія, частку — Сербія. 15 лістапада 1918 года ў Новым Садзе быў скліканы сход, які даў згоду на ўваход краю ў склад Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў.

У 1941 годзе сюды ўвайшлі войскі Германіі і Венгрыі. Частку Ваяводзіны вярнулі Венгрыі, але толькі частку. Камусьці ў Берліне прыйшла ў галаву ідэя стварыць асобную дзяржаву Банат пад кантролем нямецкай меншасці. Пакуль ладзілі эксперымент, прыйшла




Чырвоная Армія і партызаны Ціта.

У 1945 годзе Ваяводзіна атрымала правы аўтаномнай правінцыі ў складзе Сацыялістычнай сербскай рэспублікі, якая, у сваю чаргу, увайшла ў Сацыялістычную Федэратыўную Рэспубліку Югаславія (СФРЮ). Канстытуцыя СФРЮ ад 1974 года яшчэ больш пашырыла правы Косава і Ваяводзіны: так, у парламенце СФРЮ прадстаўнікі ад згаданых правінцый маглі накласці вета на любыя законы.

Пашырэнне правоў ускраін выклікала пратэсты з боку фракцыі сербскіх нацыяналістаў унутры Саюза камуністаў Югаславіі. Калі ў 1989 годзе да ўлады прыйшлі нацыяналісты пад кіраўніцтвам Мілошавіча, пачалася імклівая рэвізія правоў Ваяводзіны. Правінцыя фармальна захавала аўтаномію і парламент, аднак на самай справе, як і іншыя правінцыі, яна моцна кантралявалася цэнтрам.

Вяртанне былых правоў пачалося пасля падзення рэжыму Мілошавіча. Працэс быў нялёгкім. Ліга сацыял-дэмакратаў Ваяводзіны і Венгерская партыя — галоўныя лабісты закона аб аўтаноміі — знаходзіліся ў парламенце ў меншасці. Каб правесці закон аб вяртанні аўтаноміі, ім былі патрэбныя галасы буйных сербскіх партый — сацыялістаў і дэмакратаў, якія традыцыйна бачаць у любым пашырэнні правоў рэгіёнаў замах на адзінства дзяржавы.

Спатрэбіўся амаль год, каб шляхам перамоў атрымаць ад сербаў згоду на падтрымку законапраекта. Як заявіў на днях прэм'ер Мірка Цветковіч, хутка закон аб аўтаноміі Ваяводзіны будзе прыняты.

Было лагічна чакаць, што аднаўленне аўтаноміі краю выкліча пратэсты сербскіх нацыяналістаў. Таму аўтары закона ўвесь час абавязкова робяць акцэнт на тым, што аўтаномія Ваяводзіны не ёсць новая сепарацыя.

"Няма падстаў казаць пра тое, што мы сепаратысты, — кажа адзін з лідэраў руху за аўтаномію, старшыня Лігі сацыял-дэмакратаў Ваяводзіны ў інтэрв'ю нямецкай газеце "Tageszeitung". — Ідзе паступовы працэс падрыхтоўкі краіны да ўступлення ў Еўрасаюз. Сярод іншага Брусель патрабуе ад краін-кандыдатаў паважаць нацыянальныя меншасці і гарантаваць ім права на самакіраванне".

Ваяводзіна атрымае больш правоў на развіццё культуры і навуковых устаноў. Закон дазваляе заснаваць тут Акадэмію навукі і мастацтва. Статус аўтаноміі дазволіць мясцоваму ўраду інвеставаць грошы ў развіццё прадпрыемстваў. Будзе створаны рэгіянальны банк. Адным словам, прыхільнікі Вялікай Сербіі могуць спаць спакойна.

Аднак, калі меркаваць па рэакцыі сербскай нацыяналістычнай прэсы, пераканаць іх будзе цяжка. У сербскіх дзяржаўнікаў свая аргументацыя. Уважліва перачытаўшы тэкст закона, яны знайшлі там вельмі небяспечныя параграфы. Напрыклад, закон дазваляе мясцоваму ўраду развіваць міжнародныя кантакты ў абыход цэнтральных органаў. Сапраўды, у Новым Садзе не хаваюць ідэі адчыніць прадстаўніцтва Ваяводзіны ў Бруселі, каб наўпрост працаваць з еўрапейскімі фондамі рэгіянальнага развіцця. Такім чынам, Ваяводзіна ператвараецца ў дзяржаву ў дзяржаве, б'е трывогу нацыяналістычная прэса. Наступным крокам, калі верыць нацыяналістам, стане новая фаза падзелу краіны, як было ў выпадку з Косава.

Аднак і па той бок барыкад не ўсе ў захапленні ад закона. Партыі, якія выступалі за аднаўленне аўтаноміі, кажуць, што закон кампрамісны. Край так і не атрымаў назад цалкам тых правоў, якія меў да 1989 года. Парламент у Новым Садзе не зможа прымаць законы, падатковая сістэма цалкам застанецца ў руках цэнтра. Праўда, нават самыя вялікія радыкалы прызнаюць, што закон — гэта няхай і паступовае, аднак вызваленне палітычнага сербскага дыскурсу ад імперыялістычнай спадчыны Мілошавіча.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАЛАЙ-ЛАМА



Духоўны лідэр тыбецкага руху за незалежнасць, які з 1959 года жыве на Захадзе, час ад часу наведвае Усходнюю Індыю — цэнтр тыбецкай палітычнай эміграцыі. Зараз ён зноў вырашыў наведаць былых суайчыннікаў, што прывяло да росту напружанасці ў рэгіёне. Амаль кожны дзень кітайскія і індыйскія памежнікі праводзяць абмен ракетнымі ўдарамі і парушаюць мяжу. Алею ў полымя падлілі кітайскія манеўры з удзелам 50 тысяч салдат (усяго ў Тыбеце размешчаны 200 тысяч кітайскіх вайскоўцаў). Індусы, у сваю чаргу, пабудавалі дарогу і чыгунку, якая звязала гэты раён з цэнтрам краіны. Дададзім, што Пекін да гэтага часу адмаўляецца прызнаваць мяжу, што была вызначана яшчэ ў 1914 годзе ўрадам Тыбета і брытанскай каланіяльнай адміністрацыяй Індыі, якая падтрымлівала амбіцыі Лхасы на атрыманне незалежнасці ад Кітая. Калі 13 кастрычніка прэм'ер Індыі наведаў гэты рэгіён, Пекін даслаў ноту пратэсту з нагоды наведвання "спрэчнай тэрыторыі". Такую ж паперу атрымаў індыйскі МЗС напярэдадні візіту Далай-ламы. "Далай-лама вольны наведваць Індыю", — такім быў адказ Дэлі. Самі тыбецкія эмігранты кажуць, што справа зайшла занадта далёка. Калі Далай-лама не наведае Таванг (сталіцу эмігрантаў), ягонаму прэстыжу будзе нанесены моцны ўдар.

### РОЛА ДАШЦІ



Рола — адна з чатырох жанчын-дэпутатаў, якія засядаюць у парламенце Кувейта (усяго тут 50 абраннікаў народа), і адзіная, якая не носіць паранджу. Гэта даўно зрабіла яе мішэнню для атак ісламскіх кансерватараў. Аднак цяпер Дашці можа не звяртаць увагу на іх забабоны. Канстытуцыйны суд пастанавіў, што жанчыны-дэпутаты могуць хадзіць на пасяджэнні заканадаўчага органа без паранджы і нават без хусткі. Цікава, што запыт на гэты конт у Канстытуцыйны суд падалі менавіта ісламісты. "Гэта перамога для нашай канстытуцыі. Носім мы або не носім хусткі — гэта не ўплывае на нашу дзейнасць як дэпутатаў", — пракаментавала Рола вердыкт суда. У сваю чаргу, прыхільнікі шарыяту заявілі, што ў свае праграмы на наступныя выбары ўнясуць пункт пра прымус парламентарыяў-жанчын насіць паранджу або хустку. Увогуле, кувейцкія жанчыны атрымалі правы галасаваць і балатавацца ў парламент усяго 4 гады таму. Трэба прызнаць, што большасць жанчын у краіне носяць паранджу, хаця канстытуцыя 1962 года гарантуе ім свабодны выбар у гэтай галіне. Дарэчы, на мінулым тыдні той жа Канстытуцыйны суд дазволіў жанчынам трымаць пашпарт у сябе, а не аддаваць яго мужу пасля заключэння шлюбу.

### КУРМАНБЕК БАКІЕЎ



Лідэра партыі "Ак Жол", якая кантралюе 80 працэнтаў дэпутацкіх месцаў кіргізскага парламента, што называецца, панесла. Нядаўна быў прыняты закон, які абавязвае кіргізаў выконваць нацыянальны гімн стоячы, абавязкова трымаючы руку на сэрцы і не фальшывіць падчас спеваў. Аднак на гэтым жаданне прымаць экзатычныя законы не знікла. Прадстаўнікі фракцыі "Ак Жол" прапануюць парламенту запатэнтаваць усе прадметы нацыянальнай культуры. Сярод іх апынуліся некалькі архітэктурных помнікаў, даліна і нават возера Ісык-Куль. У той жа спіс трапілі юрта, традыцыйнае нацыянальнае адзенне і нават музычны інструмент "камуз". Па логіцы, любое выкарыстанне гэтых прадметаў або аб'ектаў ў камерцыйных мэтах без згоды ўладальніка падпадае пад закон аб парушэнні аўтарскіх правоў. Аднак галоўная фішка ў тым, што, паводле кіргізскіх законаў, запатэнтаваць прадмет можна толькі даказаўшы сваё аўтарства ў яго стварэнні. Такім чынам, дэпутатам прыйдзецца даводзіць, што менавіта парламент стварыў возера і прыдумаў юрту. Чым законнчыцца ініцыятыва сяброў "Ак Жол", цяжка сказаць, аднак карыстальнікі кіргізскіх інтэрнэт-форумаў пераканаhealthy: калі сябры "Ак Жол" нешта ўбілі сабе ў галаву, то свайго даб'юцца.

З НАГОДЫ

# ЭПІДЭМІІ Ў ЛІТАРАТУРЫ

Алесь Гінзбург

**“Горад М., 200… год. Восень. Звычайнае жыццё, звычайныя клопаты, банальны кашаль. Але праходзіць колькі дзён, і горад ператвараецца ў вялізны шпіталь. Хвароба, якой дагэтуль не існавала. Чуткі, якія не паспяваюць за жахамі рэальнасці. Усё толькі пачынаецца…”**

Гэта не рэпартаж Першага нацыянальнага канала. Гэта рэклама рамана “Эпідэмія”, выдадзенага некалькі гадоў таму Дзмітрыем Сафронавым. “Эпідэмія” — адзін з трох раманаў-катастроф гэтага аўтара. Іх дзеянне адбываецца ў Маскве — цэнтральным рынку збыту масавай літаратуры. У двух астатніх раманах апавядаецца пра падзенне элітнага маскоўскага хмарачоса і аварыі ў маскоўскім метро.

Эпідэміі невядомых хваробаў, поруч з прыроднымі катаклізмамі і нашэсцем іншапланетнікаў, — адна з самых частых завязак сюжэтаў галівудскіх фільмаў і масавага чытва. Прычына камерцыйнага поспеху — фобіі простага чалавека: кожны з нас, прынамсі ў душы, баіцца таго, што не можа рацыянальна патлумачыць і што не ў стане кантраляваць. Ідэальна, калі гэта штосьці — яшчэ і смертаноснае. У блакбастэрах-катастрофах вызывае зазвычай адно галоўны герой і (часта) яго бландзінка — а менавіта з галоўным героем, паводле законаў псіхалогіі, чытач, незалежна ад полу, сябе аўтаматычна атаясамлівае.

І тым больш шакуе, калі высвятляецца, што пісьменнікі-фантасты “сурочылі”: мор пачаўся ў рэальнасці, хмарачосы ўпалі наяве. Пачынаюцца ўжо зусім іншыя кнігі — сацыяльныя, філасофскія, экзістэнцыйныя драмы — так, трагедыя 11 верасня 2001 года знайшла водгук у творчасці некаторых сучасных пісьменнікаў, сярод іх — француз Фрэдэрык Бэгбэдэр з кнігай “Windows on the World” (назву можна перакласці як “Вокны ў свет” або як “Від на Сусветны гандлёвы цэнтр”).

Моры, выкліканыя чумой, халерай, воспай, знайшлі адлюстраванне ў безлічы літаратурных твораў, якія паўставалі ў розныя эпохі ў розных цывілізацыях. Паспрабуем зладзіць кароткі агляд “эпідэміялагічнай” літаратуры свету.

## Чума — каралева літаратуры

Паводле гісторыкаў медыцыны, чума была ў свеце, калі ў ім яшчэ не было чалавецтва: хвароба служыла прыродным рэгулятарам папуляцыі жывёл. Зарадзілася яна, хутчэй за ўсё, у Сярэдняй Азіі, адкуль распаўсюдзілася па Зямлі. У Азіі і Афрыцы ўспыхвалі першыя эпідэміі сярод людзей, але яны не мелі вялікага распаўсюду, бо людзі жылі адасобленымі плямёнамі, якія міжсобку не дачыняліся.



Сераднявечная гравюра: Чумны лекар у спецвопратцы1665 г.

У сапраўдную пошасць чума ператвараецца, калі на Зямлі з’яўляюцца першыя гарады — з іх кучным пражываннем людзей і антысанітарыяй. Самай масавай эпідэміяй чумы стала Юстыніянава чума (VI ст): ад яе загінула 20 мільёнаў чалавек на Блізкім Усходзе. У 1348 годзе чума знесла жыцці 15 мільёнаў — гэта складала чвэрць насельніцтва Еўропы. Эпідэміі чумы наводзілі панічны страх на Стары Свет ажно да пачатку XIX стагоддзя.

Чума — вострае прыродна-ачаговае інфекцыйнае захворванне, якое паражае лімфасістэму чалавека і лёгкія. Найбольш частыя формы чумы — бубонная (моцнае запаленне лімфавузлоў) і лёгачная. Пры бубоннай форме быў невялікі шанец выжыць, лёгачная азначала смерць. Пераносчыкі чумы — пацукі, блохі, заражаная вада, а пасля — хворыя людзі і ўсё, да чаго яны дакраналіся. Узбуджальнік хваробы — чумная палачка, у 1894 годзе яе незалежна адно ад аднаго выявілі вучоныя Аляксандр Ерсэн (Францыя) і Кітазата Сібасабура (Японія).

У 1896 годзе Уладзімір Хаўкін, швейцарскі навуковец украінска-яўрэйскага паходжання, стварае першую супрацьчумную вакцыну, якая дапамагае зменшыць памеры эпідэміі ў Індыі. У наш час у свеце на чуму хварэюць прыкладна 2500 асобаў штогод. Выпадкі захворвання найчасцей фіксуюцца ў Казахстане, Туркменістане, Чачні, Манголіі, ЗША, Перу, Бірме. Смяротнасць складае 5–10 працэнтаў, але на ранніх стадыях чума — амаль 100 працэнтаў вылечная хвароба. Дзякуючы сучаснаму ўзроўню гігіены і выпрацаваным правілам лакалізацыі эпідэміі, пагроза для чалавецтва яна больш не складае.


Гравюра: “Вялікая чума” ў Лондане 1664-1665 г.

Іншая справа — мінулае чалавецтва. Для людзей старажытнасці і сярэднявечча чума выглядала сапраўднай карай Божай (гневам багоў), чымсьці, што не мела зямную прыроду. Паколькі інкубацыйны перыяд складае ўсяго пару гадзінаў, а цячэнне хваробы бязбольнае і амаль вокамгненнае (або некалькі гадзінаў, або 3–6 дзён), то, стоячы ля вакна свайго дому, жыхар еўрапейскага горада мог назіраць, як людзі то там, то сям падаюць на месцы мёртвымі, нібы іх працяла нябачная маланка. Ніякіх сродкаў уратавацца ад пошасці не было: прыбіранне бруду з вуліц было запозненым захадам, калі чума ўжо бушавала, а пра прыроду інфекцый медыкі не мелі ўяўлення. Таму людзі стараліся адгарадзіцца ад заразы, замкнуцца ў доме — але і гэта не ратавала. Нядзіўна, што ўжо ў эпасе, усеагульнапрызнаным як першы літаратурны твор на Зямлі, апісваецца чумны мор у горадзе Урук.

“Эпас пра Гільгамеша” (XXII ст. да н.э., Старажытны Шумер) апісвае адчай Гільгамеша ад таго, што ён бачыць. У яго родным горадзе пануе бог смерці Эра — трупы паўсюль, трупы плывуць па Еўфраце. Шакаваны пабачаным, асілак Гільгамеш выпраўляецца на пошукі таямніцы неўміручасці.

У Бібліі чума згадваецца двойчы — у Кнізе прарока Самуіла (раздзел 5), калі смерць ад чорных нарostaў на целе тлумачыцца як кара Гасподняя за грахі, і ў Кнізе Царстваў (раздзел 19), дзе чума ратуе Іерусалім, за ноч пакасіўшы асірыйскае войска, якое асадзіла горад.

Эпідэмія фларэнтыйскай чумы 1348 года — пачатак самага жыццярадаснага і фрывольнага твору еўрапейскай літаратуры Адраджэння — “Дэкамерона” Джавані Бакача. Пераджыўшы мор, пісьменнік апісвае яго жахі ў прадмове да рамана. Жахі не толькі фізічныя, але і маральныя: павальныя смерці і масавыя хаўтуры мяняюць стаўленне людзей да смерці як такой. Цяпер у Фларэнцыі прынята жартаваць і весяліцца, калі нехта памірае. І бедныя, і багатыя дамы пустуюць. У пакінутыя палацы забіраюцца кампаніі людзей, якія бавяць час за п’янствамі і абжорствам. Святары або памерлі, або кінулі сваіх парафіян, ніхто не дбае аб падняцці духу ці змаганні з эпідэміяй. Злачынцаў няма каму ахоўваць, і яны бясчынствуюць, ведаючы, што застануцца беспакаранымі. Ніхто не ўяўляе, што будзе з ім заўтра, фларэнтыйцы аддаюцца на волю лёсу.

У гэты час у царкве Санта Марыя Навэла сустракаюцца 10 багатых маладых людзей — сямёра паненак і трое юнакоў. Яны прымаюць рашэнне выправіцца з гораду, каб перачакаць чуму ў аддаленым кутку. Падчас затворніцтва яны забаўляюць сябе таксама расповедам займальных гісторый з гарадскога жыцця — кожны расказвае гісторыю ў дзень. Так паўстаюць 100 знакамітых навел “Дэкамерона”.

У 1772 годзе Даніэль Дэфо піша “Дзённік чумнога горада” — поўную фактаў, лічбаў дакументальную аповесць, прысвечаную Лонданскай чуме 1664–1665 года, стылізаваную пад мемуары сведкі падзеяў. Твор гэты, абсалютна ў духу эпохі Асветніцтва, спрабуе раскласці эпідэмію па палічках, абапіраючыся на хронікі ды сведчанні відавочцаў.

Галоўны герой прымае рашэнне аддацца на волю Бога і не паддаецца паніцы, застаючыся ў горадзе. Таму ён мае магчымасць ад пачатку да канца апісаць эпідэмію, яе пачатак, ход, а галоўнае — бязглуздыя паводзіны жыхароў Лондана, у асноўным іх неразумныя ўчынкі ў спробе ўратавацца ад хваробы (напрыклад, калі ў доме нехта захварэў, улады замыкалі дом разам з усімі яго жыхарамі і хворым. Часта ў доме пасля не заставалася нікога жывога, а ўцекачы з такіх дамоў яшчэ болей разносілі заразу).

Псіхалагічны феномен “балявання падчас чумы” надзвычай займаў пісьменнікаў XIX стагоддзя. Аляксандр Пушкін у 1830 годзе апынаецца замкнёным у Болдзіна — маёнтку сваёй будучай жонкі Наталлі Ганчаровай: у Пецярбургу абвешчаны каранцін па халеры. Апроч іншых твораў “болдзінскай восені” на свет з’яўляецца “Баляванне падчас чумы“ — вольны пераклад часткі драматычнай паэмы Джона Уілсана (1816 г.) “Чумны горад”, дзе апісвацца тая ж Лонданская чума 1665 года. У навеле 1842 года Эдгара По “Маска Чырвонай Смерці” прынц Праспэра, ратуючыся ад “чырвонага мору”, замыкаецца са сваім дваром у кляштары, кінуўшы народ на волю лёсу. Праз паўгода затворніцтва Праспэра ладзіць вялікі маскарад-вакханалію. У распале карнавалу ўдзельнікі заўважаюць Чырвоную Маску. За хвіліну да смерці становіцца ясна: гэта мор пранік у сховішча, жывых не застанецца.

І, нарэшце, вяршыня тэмы ў сусветнай літаратуры — раман Альбера Камю “Чума”. У ім апісваецца эпідэмія 194… года ў алжырскім горадзе Аране. Нашэсце пацукоў на і без таго бязрадасны горад правакуе ўсплёск хваробы. Спатрэбіўся час і многія смерці, каб ўлады горада прызналі эпідэмію і абвясцілі каранцін. У горадзе не стае ежы, не стае медыкаментаў, пачынаецца бунт. Галоўны герой рамана доктар Рыэ і яго таварышы гераічна і ўпарта змагаюцца супраць чумы, якая даўно паддаецца лячэнню і якой магло б і не быць.

Раман лічаць самай дасканалай алегорыяй другой сусветнай вайны і таго, што ёй папярэднічала: нездарма прэса называла фашызм “карычневай чумой”. Калі пагроза эпідэміі адступае, горад трыумфуе, але кожны разумее, што чума, у якой ён выжыў, змяніла яго: ён ужо ніколі не будзе ранейшым. Знесшы мільёны чалавечых жыццяў, чума прынесла чалавецтву безліч перажыванняў, а чалавечай думцы — мноства глыбокіх філасофскіх праблемаў, над якімі варта задумацца.

*Працяг будзе*

ЦІКАВА

# ВЯЛІКАЕ ГЕРЦАГСТВА ЛІТОЎСКАЕ

Кастусь Тарасаў

**Вялікае герцагства Літоўскае — праект, які Аляксандр I збіраўся ажыццявіць. Аднак вайна з французамі перашкодзіла гэтаму.**

## Канфідэнцыйны ліст

За тры месяцы да вайны з Напалеонам Аляксандр I перадаў канфідэнцыйны ліст Адаму Чартарыйскаму, блізкаму сябру, былому міністру замежных спраў Расіі. У гэтым лісце, па сутнасці абгрунтоўвалася ідэя герцагства:

"…Разрыв с Францией кажется неизбежным. Цель Наполеона уничтожить или, по меньшей мере, унизить последнее государство, пользующееся уважением в Европе, и, чтобы этого добиться, он выдвигает вперед неприемлемые требования, которые несовместимы с достоинством России…

Так как я бы никогда не мог согласиться на подобные предложения, то весьма вероятно, что следствием этого будет война… Она заставит кровь литься ручьями, и эти бедные люди будут опять принесены в жертву ненасытному честолюбию человека. Наполеон имел по этому поводу конфиденциальные разговоры с австрийским и прусским посланниками, и тон, в котором он высказывался, рисует прекрасно его характер и недостаток привязанности к Вашим соотечественникам, которых он считает лишь орудием своей ненависти к России.

Хотя не невозможно, чтобы мы могли с нашими войсками добраться до Вислы, даже перейти ее, и таким образом вступить в Варшаву, все-таки будет благоразумнее не строить наших расчетов на столь выгодных шансах; из-за этого рождается необходимость сообразовать наши поступки с тем, чтобы не рассчитывать на помощь и преимущества, которые бы нам могло доставить обладание Варшавой. Следовательно, нам нужно будет сосредоточить нашу деятельность в ваших областях.

Из этого вытекают несколько крайне важных для решения вопросов.

Какой самый удобный момент, чтобы провозгласить восстановление Польши? Совпадет ли он с моментом разрыва?

Будет ли это после того, как военные действия доставят нам известные высшие преимущества?

Если предпочтение может быть оказано второму условию, то будет ли полезно успеху наших планов, если учредить Великое герцогство Литовское, как предварительное мероприятие, и даровать ему одну из намеченных конституций?.."

## Праект Агінскага

Стварэнне Вялікага герцагства Літоўскага па задуме Аляксандра I магло стаць процівагай Герцагству Варшаўскаму, створанаму Напалеонам на тых землях Польшчы, якія былі далучаны Прусіяй і Аўстрыяй. Герцагства Літоўскае павінна было задаволіць прапольскія патрыятычныя жаданні шляхты і ўзмацніць яе прарасійскія пачуцці. Герцагства планавалася ўтварыць з васьмі губерняў — Віленскай, Менскай, Віцебскай, Магілёўскай, Валынскай, Падольскай і Кіеўскай. Праект утрымліваў пункты аб асабістым вызваленні ад прыгоннай залежнасці сялянства і стварэнні 100-тысячнага войска, якое ўваходзіла б у склад расійскага, але мела адмысловую форму.

Галоўным аўтарам праекту быў князь Міхал Клеафас Агінскі, былы міністр фінансаў ВКЛ, камандзір батальёна паўстанцаў Касцюшкі. Потым ён эміграваў і пяць гадоў ездзіў па Еўропе, але дзеля атрымання права на ўласнасць прынёс прысягу на вернасць



Міхал Клеафас Агінскі

Аляксандру I. Цар даў яму чын расійскага сенатара, узяў у сваю світу. Агінскі ездзіў у Парыж, дзе сустракаўся з Напалеонам і яго вышэйшымі саноўнікамі. Калі б Напалеон адцягнуў з пачаткам вайны хаця б на год, Вялікае герцагства Літоўскае мела шанец з'явіцца на карце. Але Напалеон пачаў вайну ў 1812 годзе.

## Вайна

Стварыўшы на заходніх межах групоўку ў 450 тысяч чалавек (пазней да яе далучыліся яшчэ 150 тысяч), Напалеон разлічваў разбіць рускія войскі ў межах Беларусі і прадыктаваць свае ўмовы свету. Імператар паведаміў маршалам сваю стратэгію: "Я пачну кампанію пераходам праз Нёман. Скончу яе ў Смаленску і Мінску. Там спынюся. Я ўмацую гэтыя два горада і займуся ў Вільні, дзе будзе мая галоўная кватэра ў найблізкую зіму, уладай Літвы, якая прагне скінуць з сябе рускі прыгнёт".



Войска Напалеона

Аднак у рэальнасці ўсё пайшло не так, як задумвалася. Сталі выяўляцца ўсе заганы Вялікага войска, якое на 297 французскіх батальёнаў мела 307 батальёнаў з розных краін Еўропы, а на 38 тысяч французскай конніцы — 42 тысячы кавалерыстаў з падпарадкаваных краін. Да марадзёрства дадалося масавае дэзерцірства. Каля 60 тысяч дэзерціраў — больш, чым забітых і параненых, — адседжваліся ў лясах.

У Вільні на трэці дзень прыходу французаў Напалеон стварыў Камісію часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага.

За абяцанне ўзнавіць Вялікае княства трэба было сфармаваць 5 пяхотных і 4 уланскіх палкі. Яны атрымалі нумарацыю палкоў, як у польскім корпусе Панятоўскага, — з 18-га па 22-і ў пяхоце, з 17-га па 20-ы ў кавалерыі. Арганізацыя, форма і штаты ўсталёўваліся па ўзор польскіх. Уланы насілі чорную канфедэратку, але замест польскага арла на ёй мацавалася выява "Пагоні".

Былі створаны і прылічаны да імператарскай гвардыі гвардзейскі лёгкаконны полк у складзе 1280 чалавек, камандзірам якога Напалеон зацвердзіў брыгаднага генерала Канопку. Полк павінен быў камплектавацца добраахвотнікамі са шляхты. Форма была аналагічнай польскаму I гвардзейскаму палку. Тэрмін службы для ўсіх рэкрутаў быў усталяваны 6 гадоў. Рэкрутам з прыгонных абяцалі па вяртанні з вайны перадаць ва ўласнасць зямельны надзел. Статутнай мовай каманд была польская.

Да часу адступлення Напалеона, у сярэдзіне лістапада, падпарадкаваныя яму войскі ВКЛ складалі 20 тысяч чалавек. Для параўнання: Аўстрыя дала для напалеонаўскай арміі 30 тысяч салдат, Швейцарыя — 16 тысяч, Галандыя — 52 тысячы, палякі выставілі 60 тысяч кавалерыі і пяхоты.



Аляксандр I

З прыходам французаў сялянскае і гарадское насельніцтва Беларусі паспытала ўсе нягоды акупацыі. Толькі ў жніўні ў Беларусі, згодна ўказам Напалеона, рэквізіцыям падлягалі 528 тысяч тон хлеба, 100 тысяч тон аўса, 53 тысячы галоў быдла, 4,5 тысячы тон сена. Былі ўведзены падаткі з прыбытку на гарэлку, рыбу, алей, тытунь і інш. Усе патрабаванні па рэквізіцыях, новых падатках і паборах паведамляліся на польскай мове.

Абвясціўшы сябе вызваліцелем Беларусі і Літвы "ад рускага прыгнёту", Напалеон запатрабаваў кампенсаваць у сваю казну ўсе нядоімкі папярэдняй расійскай адміністрацыі. У Менскай губерні ён сабраў 539 тысяч рублёў срэбрам.

## Лёс салдат

Істотнай ваеннай дапамогі імператар ад літоўскіх палкоў не дачакаўся. Атрад генерала Касецкага, накіраваны з Менска да Навасвержаню, 13 лістапада быў пабіты рускімі егерамі. На наступны дзень рэшткі яго былі разгромлены пад Койданава, у палон трапілі 2000 чалавек. Астатнія рушылі да Барысава.

Гвардзейскі полк Канопкі 19 кастрычніка пад Слонімам быў пабіты генералам Чапліцам. У палон трапілі сам генерал Канопка, 13 афіцэраў і 253 ніжніх чыноў. Татарскі эскадрон Ахматовіча таксама ваяваў пад Слонімам, прымаў удзел у абароне Вільні ў снежні 1812-га. Ад эскадрона засталася адна рота, якая ў 1813 годзе ў колькасці 3 афіцэраў і 15 радавых была прылічана да палка польскіх улан Красіньскага.

У студзені 1813 года Напалеон узяў рэшткі літоўскіх войскаў (6000 чалавек пяхоты, 2000 конніцы) на французскае ўтрыманне. 20-ты уланскі полк і невялікая частка 19-га былі накіраваны ў Данцыг і перададзены ў склад 9-га польскага палка, артылерыйская рота Тызенгаўза ўвайшла ў склад польскай артылерыі, 17-ты і 19-ты палкі прынялі ўдзел у абароне Гамбурга, пасля чаго беларускія ўланы ўліліся ў войска Царства Польскага. Пяхотныя 18, 20, 21-ы палкі склалі гарнізон крэпасці Модлін, які вытрымаў аблогу 50-тысячнага расійскага корпуса.

## Зніклае герцагства

Пасля спалення Масквы і бітвы каля Малаяраслаўца французскае войска пачало адыходзіць па Смаленскай дарозе бліз Барадзіна, дзе ляжалі 100 тысяч забітых, да Бярэзіны, каб у вёсцы Студзенка, пакінуўшы 40 тысяч пры пераправе, сысці з Расійскай імперыі. 1 студзеня 1813 года рускае войска ўступіла ў Еўропу. Вайна з Напалеонам ішла яшчэ два гады, і нарэшце ў бітве пры Ватэрлоо французы былі разгромленыя. Напалеон на англійскім фрэгаце быў адпраўлены на востраў св. Алены.

У 1815 годзе Аляксандр I утварыў у імперыі Царства Польскае, даўшы яму




Канстытуцыю, сойм, польскі ўрад, 100-тысячнае войска, волю сялянам.

Беларусь засталася па-за межамі Царства Польскага, у складзе старых губерняў, страціўшы за шэсць месяцаў ваеннага ліхалецця 500 тысяч насельніцтва, 100 тысяч галоваў быдла, 700 тысяч тон хлеба, адзін мільён срэбраных рублёў.

Захапіўшы Варшаву, Аляксандр I забыўся на праект Агінскага, і хутка адносіны паміж імі сталі прахалоднымі. Кан'юнктурная неабходнасць у стварэнні Вялікага герцагства Літоўскага адпала.

СВЯТА

# КУЛЬТ ПРОДКАЎ НА СУЧАСНЫ ЛАД

Анатоль Мяльгуй

**Якіх толькі музычных вечарын, прысвечаных святу Halloween, не зведала наша сталіца ў канцы кастрычніка: тут прайшлі і Halloween Masquerade, і Halloween Fire-Party, і Halloween El Monstro Rave 2009. Гэта хутчэй вынік каланіяльнага стану свядомасці арганізатараў такіх імпрэзаў, а таксама адсутнасці фантазіі і жадання глянуць на культурную спадчыну свайго народа хоць бы з пазіцыі трэндаў сучаснасці.**

Таму можна толькі горача вітаць з’яўленне ў мінскай музычнай афішы імпрэзы, якая аб’ядноўвала модныя тэндэнцыі з гісторыі старажытных кельтаў і ўласна беларускія традыцыі памінання Дзядоў. Гэтую мэту паставіў перад сабой вядомы беларускі даследчык этнаграфіі, музыкант і прадзюсер Юрый “Франц” Выдронак, калі прапанаваў сталічнай публіцы стаць гледачамі містычнага тэатралізаванага канцэрта паводле паэмы Адама Міцкевіча “Дзяды” і народнага абраду ўшанавання памерлых продкаў. Гэту музычную дзею Юрый запланаваў у рамках уласнага праекта — V міжнароднага фолк-мадэрн-фэсту “Таўкачыкі”. Таму спектакль займеў адпаведную назву “Таўкачыкі на Дзяды, або Halloween па-беларуску”.

Паэма А. Міцкевіча “Дзяды” — даволі складаны твор для ўвасаблення ў выглядзе музычнай тэатралізаванай пастаноўкі. Але ўдзельнікі тэатра “ІНЖЭСТ” пад кіраўніцтвам В. Іназемцава нагадалі змест паэмы мовай пантамімы і пластыкі першасных рытуальных формаў тэатра. Дасягненню гэтай мэты “Таўкачыкаў на Дзяды” спрыялі і арыгінальныя дэкарацыі ў выглядзе драўляных крыжоў і надмагілляў-саркафагаў, якія сімвалічна ўзламвалі душы памерлых. Такія сцэнічныя вобразы з’явіліся ў рэжысёра пастаноўкі Юрыя Выдронка не толькі пад уплывам творчасці Міцкевіча, але і этнаграфічных матэрыялаў 20-х гадоў мінулага стагоддзя, вынікаў уласных экспедыцый.

Музычным суправаджэннем пластычнай дзеі ад тэатра “ІНЖЭСТ” стала кампазіцыя гурта “UR’IA” “Суботачка”, якую музыкі выканалі ў акустычным варыянце. У складзе гурта, акрамя сталых удзельнікаў, былі заўважаны і госці фэсту — напрыклад, вядомы польскі мультыінструменталіст Барталамей Лех Палыга, які ў складзе “UR’IA” граў на рэдкім у Еўропе індыйскім інструменце сарангі.

Горача, воклічамі “брава!” прымалі пастаноўку паводле абраду “Дзяды”, які аднавілі пад кіраўніцтвам Святланы Яфімавай удзельнікі дзіцячага фальклорнага ансамбля мінскай сярэдняй школы № 3. Дарэчы, на гэтым фэсце ансамбль упершыню выступіў пад новай назвай — “Гарлачыкі”. Маленькія выканаўцы змаглі ўзрушыць дасведчаную аўдыторыю сваім трапяткім стаўленнем да мудрай спадчыны Дзядоў, захапілі ўвагу гледачоў сваёй артыстычнасцю і далікатнасцю.

“Гарлачыкаў” на сцэне змяніў этна-эмбіент-гурт “Дзівасіл” з салісткай Ірынай Перасецкай-Малаковіч. Эмбіент-рытмы, элементы псіхадэліі служылі аправай для фальклорных матываў кампазіцый гурта — “Сіроцкай”



Гарлачыкі

і “Восеньскай” песень.

А вось знакамітая “Альтанка” выйшла на фестывальную сцэну з балалайкай, на якой граў лідэр гурта Дзмітрый Лук’янчык. Канешне, у самой сутнасці гэтага інструмента няма нічога супярэчнага, але для беларускай культуры балалайка застаецца амаль незасвоенай слухацкай аўдыторыяй. Калі гаварыць пра постмадэрнісцкае асэнсаванне фальклору, то музыкі “Альтанкі” маюць права на свой погляд на нацыянальнае ў музыцы. І гэта яны прадэманстравалі падчас свайго сэту на “Таўкачыках”...

Музыкі гурта этнічнага сюррэалізму “Нагуаль” прадставілі тую частку сваёй праграмы, якой уласцівы псіхалагічная заглыбленасць, нават трансцэдэнтальнасць.

Добрая традыцыя “Таўкачыкаў”, якія ўжо ў пяты раз у сталіцы і ў рэгіёнах Беларусі праводзіць Ю. Выдронак, — запрашэнне лепшых фолк-выканаўцаў з суседніх краін. Сёлета міжнародны статус фэсту падтрымалі “зборная каманда лепшых фолк-выканаўцаў Польшчы” (па адзнацы Ю. Выдронка) — музыкі гурта “Zespoi Polski” пад кіраўніцтвам знакамітай выканаўцы і педагога Марыі Памяноўскай.

Трэба адзначыць, што ў польскай традыцыі таксама існуе нешта накшталт Halloween’у, які завецца “Дзень вышэтых свёнтых”. Таму гэтым разам у праграме польскіх гасцей яскрава гучала “задушная” тэматыка, а музыка “Zespoi Polski” скіроўвала слухачоў у міцкевічаўскую



Юры Выдронак

сімвалічную плынь святкавання Дзядоў.

Зусім іншую музычную традыцыю ўспамінаў продкаў, цяпер ужо персідскую, прадставіў вядомы ў Беларусі курдскі музыкант Масуд Талебані. Разам з Барталамеем Лехам Палыгам (сарангі), Юрыем Задзіранам (акустычная гітара). Да таго ж, мала хто ў Беларусі чуў, як “ужывую” гучыць арыенталісцкі фолк-джаз. Яго першым выканаўцам у нашай краіне стаў Масуд Талебані!

Але ж цэнтрам спектакля, яе эмацыянальным пікам стала знаёмства з удзельніцамі этнаграфічнага гурта “Глыбокія крыніцы” з вёскі Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці. Не кожны дзень пачуеш спевы тых выканаўцаў, чыя песенная манера ўнесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Сусветнай спадчыны ЮНЭСКА!

Вясковыя пявунні пад кіраўніцтвам Надзеі Мірэйчык прадставілі зусім рэдкае сёння відовішча — адноўлены абрад Дзядоў, які суправаджаўся аўтэнтычнымі спевамі, замовамі, пачастункам для памерлых. Як заўважыў у прадмове да паэмы “Дзяды” Адам Міцкевіч: “Просты народ верыць, што частаваннем і песнямі ён прыносіць палёгку душам, якія пакутуюць...” Трэба было ў тое імгненне быць у зале Купалаўскага тэатра, каб адчуць усепаглынальную цікаўнасць гледачоў, якія напружана сачылі за старонкамі гэтага сакральнага абраду, за ўсімі мізансцэнамі дзеі, узрост якой налічвае тысячы гадоў!

Пасля галашэнняў у выкананні гурта “Глыбокія крыніц”, якія былі традыцыяй падчас наведвання могілак на Дзяды, Юрый Выдронак у выразнай фальклорнай манеры разам з вясковымі спявачкамі выканаў песню “Тры ангелы”. Словы з яе: “У нашым раю жыць весела, ды толькі некаму...” — нагадалі ўсім, што продкаў трэба ўспамінаць не толькі на Дзяды, а жыццё напаўняецца стваральным сэнсам толькі жывымі.

Праграма Ph.D. in Economics (кандыдат эканамічных навук) у CERGE-EI

Знаходзіцца ў Празе | Акрэдытаваная ў ЗША

CERGE-EI, сумесная праграма Карлава Універсітэта (Прага) і Акадэміі Навук Чэскай Рэспублікі, запрашае зацікаўленых студэнтаў і выпускнікоў беларускіх ВНУ, якія хочуць атрымаць ступень кандыдата эканамічных навук (Ph.D. in Economics), падаць заяву аб прыёме.

- Навучальная праграма сусветнага ўзроўню ў галіне эканомікі, поўнасцю акрэдытаваная ў Чэхіі і ЗША,
- Шматнацыянальная супольнасць – выкладчыкі і студэнты з больш чым 30 краінаў Свету,
- Усё навучанне на англійскай мове,
- Прымаюцца студэнты з адукацыяй у любой галіне, але папярэдні вопыт вывучэння эканамічных навук і вышэйшай матэматыкі карысны,
- Амаль усе студэнты вызваленыя ад платы за навучанне і атрымліваюць стыпендыю,
- Большасць студэнтаў CERGE-EI праводзіць частку сваёй вучобы за мяжой,
- Нашыя выпускнікі працуюць на адказных пасадах у заходніх універсітэтах, міжнародных арганізацыях, цэнтральных банках, міжнародных кансалтынгавых фірмах і рэгіянальных аналітычных цэнтрах.

Дадатковую інфармацыю і бланкі заявак вы можаце знайсці на сайце **www.cerge-ei.cz/phd**.

CERGE-EI

**Кантактная інфармацыя:**
Student Affairs Office
P. O. Box 882
Politických vězňů 7
111 21 Prague 1
Czech Republic
тэлефон: (+420) 224 005 161
факс: (+420) 224 005 247
электронная пошта:
grad.stud@cerge-ei.cz



Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад **12.01**.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 13.11.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.